Na podstawie źródeł cerkiewnych i administracji państwowej możemy odtworzyć listę proboszczów i psalmistów prawosławnych w Dojlidach w ostatnim dwudziestoleciu przed wybuchem I wojny światowej. 20 grudnia 1896 r. proboszczem parafii dojlidzkiej został o. **Flor Sosnowski**, który sprawował swą funkcję do 20 marca 1901 r. Psalmistą w tym czasie był Włodzimierz Bałabuszewicz (1893-1912)[113]. W 1899 r. dyplom pochwalny z błogosławieństwem od arcybiskupa litewskiego Juwenaliusza (1898-1904) otrzymał Michał Moroziewicz z Grabówki za 53 lat pełnienia obowiązku starosty cerkwi dojlidzkiej. Po wyjeździe o. Flora[114] parafię Narodzenia

108 Tamże, s. 28.

109 „Клировые ведомости” za 1850 r., rękopis.

110 Archiwum Państwowe w Białymstoku (dalej: APwB), Wojewódzki Urząd Ziemski w Białymstoku, nr zesp. 76, sygn. 234, k. 123.

111 Ks. G. Sosna, A. Troc-Sosna, *Cerkiewna własność ziemska na Białostocczyźnie w XV-XX wieku*, Białystok 2004, s. 491-492.

112 *Wykaz ziem cerkiewnych, które Kościół prawosławny utracił w okresie od 1914 do 1930 roku włącznie. Informacja wojewody białostockiego z 1930 r. Powiat białostocki*. Archiwum Akt Nowych w Warszawie (dalej: AAN), Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego (dalej: MWRiOP), sygn. 1193, k. 87; Odpisy *Informacji*, por.: Archiwum Parafii Prawosławnej w Dojlidach, kartki luźne.

113 Ks. G. Sosna i A. Troc-Sosna, *Hierarchia i kler...*, s. 814, 91.

114 O. Flor Sosnowski posiadał pod Białymstokiem majątek, do którego zapraszał na dożywocie samotnych księży. „Majątek mój — pisał emerytowany duchowny w 1905 r. — Kolonia-Zacisze leży przy samej poleskiej Białostocko-Baranowickiej kolei i stacji, obok dobrze urządzonych koszar Kazańskiego pułku, w którym znaj-

NMP w Dojlidach objął 23 kwietnia 1901 r. tylko co wyświęcony przez biskupa grodzieńskiego Joachima (1900-1903) o. **Aleksander Kaliszewicz**, który zapewniał opiekę duszpasterską do ewakuacji w 1915 r. Duchowny był gorliwym duszpasterzem, cenionym katechetą, za co w 1914 r. przez Synod został nagrodzony *krzyżem napierśnym*. Obowiązki psalmisty od 19 maja 1912 r. pełnił Piotr Żuk[115]. W tym czasie wieś Dojlidy liczyła 15 domów ze 197 mieszkańcami. Dojlidy miały 327 dziesięcin włościańskich i 40 dziesięcin cerkiewnych. Zaś dobra hrabiów Rüdigerów z folwarkiem posiadały 6941 dziesięcin[116]. Cerkiew drewniana Narodzenia NMP o rozmiarach 12 x 8 metrów wraz z dzwonnicą była traktowana jako zabytek i znajdowała się pod opieką administratora majątków Rüdigerów. Z tego powodu nie uległa ona zniszczeniu po ewakuacji ludności prawosławnej w 1915 r.

Podczas I wojny światowej, pod nieobecność przebywającej w Niemczech Zofii Rüdiger, administratorem majątku dojlidzkiego był baron Rudolf von Brandstein (1871-1957). Administrator, dzięki swym wpływom we władzach okupacyjnych, sprowadził z Niemiec do Dojlid nawozy sztuczne, bydło i ziarno siewne. Brandstein, oprócz cerkwi prawosławnej, opiekował się też wybudowaną przez Rüdigerów ich rodową kaplicą cmentarną[117]. Pomimo, że po zakończeniu wojny prawosławni zaczęli wracać z „bieżeństwa" cerkiew dojlidzka Narodzenia NMP parafianom nie została zwrócona. Komisarz Rządu Polskiego na powiat białostocki 3 kwietnia 1919 r. przejął „wszelki ruchomy i nieruchomy majątek pocerkiewny oraz stanowiący uposażenie duchowieństwa prawosławnego pod przymusowy zarząd państwowy"[118].

Na początku II Rzeczypospolitej władze państwowe nie zezwoliły na funkcjonowanie parafii prawosławnej w Dojlidach. Cerkiew Narodzenia NMP, drewnianą dzwonnicę, dom parafialny i uposażenie ziemskie prawosławnej parafii dojlidzkiej władze bezprawnie przekazały parafii rzymskokatolickiej, wraz z uposażeniem ziemskim. Powołano się na fakt, że rzekomo w Dojlidach mieszkało jedynie 60 osób wyznania prawosławnego. Informacja ta nie była prawdziwa, albowiem według danych parafialnych

duje się piękna, nowa, obszerna i ciepła cerkiew pułkowa, zbudowana na mojej ziemi w minionym 1904 roku". Por.: S. Borowik, *Parafia odrodzona*, s. 28.

115 Ks. G. Sosna i A. Troc-Sosna, *Hierarchia i kler...*, s. 363, 982.

116 *SGKP*, t. XV, cz. 1, s. 423.

117 W kaplicy rodowej Rüdigerów pochowani zostali Aleksander Krusenstern i jego żona Elisabeth Fuhrmann, ich syn Aleksander (1887), Johann Friedrich Rüdiger (1904), oraz syn Friedricha i Zofii Rüdigerów — Fiodor (1862-1891), kapitan armii rosyjskiej, który zginął w pojedynku we Francji. Por.: Ks. mitrat A. Nestorowicz, *Zarys historii parafii prawosławnej św. Proroka Eliasza w Dojlidach*, maszynopis, k. 4.

118 *List do proboszcza parafii z 3 kwietnia 1919 r.,* Archiwum Parafii Prawosławnej w Dojlidach, kartki luźne.

i akt Konsystorza Grodzieńskiego do cerkwi dojlidzkiej przypisanych było 1408 parafian (725 mężczyzn i 683 kobiet)[119].

Pierwsze nabożeństwo łacińskie w cerkwi Narodzenia NMP z udziałem przedstawicieli władz lokalnych i Ministerstwa Spraw Wewnętrznych odbyło się 6 lipca 1919 roku[120]. Wobec protestów ludności prawosławnej 26 czerwca 1919 r. Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego poleciło bezzwłocznie przekazać do użytku parafian rzymskokatolickich cerkiew prawosławną w Dojlidach[121]. 33 dziesięciny ziemi cerkiewnej duchownemu katolickiemu przekazano na wniosek tegoż ministerstwa 11 listopada 1921 roku[122]. Ikonostas i wyposażenie cerkiewne zostały zabrane przez starostę Jana Parfienowicza i wywiezione do kaplicy w Puchłach. Wierni dojlidzcy zostali przypisani do parafii św. Mikołaja w Białymstoku.

W Dojlidach w rękach prawosławnych pozostał tylko cmentarz z pięknym grobowcem rodziny hrabiów Rüdigerów. Parafianie dojlidzcy wyremontowali kaplicę Rüdigerów i wykorzystywali ją w trakcie pogrzebów[123]. Dawna parafia dojlidzka i jej wierni, zgodnie z decyzją władz państwowych i cerkiewnych, 1 czerwca 1921 r. zostali dołączeni do parafii św. Mikołaja w Białymstoku[124]. Taki stan rzeczy utrzymał się do zakończenia II wojny światowej[125].

119 *Wiadomości o cerkwiach prawosławnych, monasterach i duchowieństwie Diecezji Grodzieńskiej na powiaty sokólski, białostocki i bielski wg stanu na dzień 1 listopada 1919 r.,* załącznik nr 11715, Archiwum Parafii Prawosławnej w Dojlidach, kartki luźne.

120 Relację z tego wydarzenia na pierwszej stronie przedstawił „Dziennik Białostocki" 8 lipca 1919 r.

121 *Depesza Ministra MWRiOP z 26 czerwca 1919 r. do Komisarza Rządowego na powiat białostocki*, Archiwum Parafii Prawosławnej w Dojlidach, kartki luźne.

122 *List dyrektora departamentu MWRiOP do Ministerstwa Rolnictwa i Dóbr Państwowych z 9 października i 11 listopada 1921 r.*, Archiwum Parafii Prawosławnej w Dojlidach, kartki luźne.

123 A. Mironowicz, *Świątynie prawosławne na terenie miasta Białegostoku*, „Białostocki Przegląd Kresowy", 1998, t. VI, pod red. J. F. Nosowicza, s. 109.

124 AAN, MWRiOP, sygn. 1034, k. 217-218.

125 W 1946 r. ks. Piotr Gutkiewicz przekształcił grobowiec Rüdigierów w kaplicę cmentarną i adoptował ją do odprawiania nabożeństw. W wyniku wieloletnich starań metropolity warszawskiego Makarego (Oksijuka) 21 stycznia 1953 r. Prezydium Wojewódzkiej Rady Narodowej w Białymstoku zgodziło się na restaurację parafii prawosławnej w Dojlidach i wyraziło zgodę na budowę nowej plebani w pobliżu cmentarza. Pierwszym proboszczem odnowionej parafii dojlidzkiej został ks. Mikołaj Pasternacki (1951-1953). W 1953 r. kaplicę rozbudowano i przekształcono w cerkiew parafialną. Kaplicę Rüdigerierów wkomponowano w część ołtarzową świątyni. Rozbudowa świątyni nastąpiła za probostwa ks. Aleksandra Tomkowida (1953-1979). Nowa cerkiew została poświęcona w 1970 r. pod wezwaniem św. Proroka Eliasza. W latach 1979-1983 proboszczem dojlidzkiej parafii był ks. mitrat Aleksy Nestorowicz, a po jego śmierci ks. Mikołaj Borowik (1983-2008). W latach osiemdziesiątych rozbudowano budynki parafialne, obok których wzniesiono żeński monaster Narodzenia

Z 1919 r. posiadamy informację o liczbie prawosławnych parafian z dawnej parafii dojlidzkiej. Według danych MWRiOP w Dojlidach Fabrycznych mieszkało 18 parafian, w Bagnówce — 44, Pieczurkach — 17, Sowlanach — 19, Grabówce — 47, Sobolewie — 59, we wsi Płoskie — 30, Kurianach — 132, Olmontach — 9, Skorupach — 18 i Lewickich — 78[126]. Dane te nie obejmują wsi Dojlidy ani też faktu, że większość parafian nie powróciła jeszcze z „bieżeństwa". W innym zestawieniu z 1921 r. to same ministerstwo przyznało, że na terenie dawnej parafii dojlidzkiej mieszka 1408 prawosławnych[127].

Liczba urodzeń, zgonów i ślubów w parafii Dojlidy w latach 1878-1912[128]

Rok	Liczba wiernych			Liczba urodzeń			Liczba zgonów			Liczba ślubów
	M	K	Razem	M	K	Razem	M	K	Razem	
1804	226	233	459	bd	bd	bd	bd	bd	bd	bd
1838	bd	bd	672	8	11	19	8	5	13	4
1878	bd	bd	bd	bd	bd	76	bd	bd	47	14
1879	817	873	1690	bd	bd	93	bd	bd	39	19
1880	878	921	1799	32	35	67	30	21	51	7
1882	891	933	1824	43	43	86	29	34	63	9
1883	908	939	1847	38	36	74	25	17	42	17
1884	bd	bd	bd	bd	bd	87	bd	bd	58	19
1885	954	949	1903	41	41	82	21	35	56	16
1887	996	997	1993	41	55	96	23	16	39	10
1888*	996	997	1993	41	55	96	23	16	39	10
1901	bd	bd	bd	bd	bd	71	bd	bd	31	23
1904	bd	bd	bd	bd	bd	69	bd	bd	39	15
1906	bd	bd	bd	bd	bd	58	bd	bd	36	21
1907	bd	bd	bd	bd	bd	68	bd	bd	33	22
1908	bd	bd	bd	bd	bd	67	bd	bd	37	22
1909	bd	bd	bd	bd	bd	62	bd	bd	36	19
1910	bd	bd	bd	bd	bd	65	bd	bd	37	23
1911	bd	bd	bd	bd	bd	88	bd	bd	45	17
1912	bd	bd	bd	bd	bd	64	bd	bd	62	15

bd — brak danych; M — mężczyzn; K — kobiet; * — dane powtórzone

NMP. Ks. Mikołaj Borowik uporządkował cmentarz, powiększył jego powierzchnię. Przy parafii rozpoczęły działalność bractwo cerkiewne i kiosk cerkiewny. W 2008 r. obowiązki proboszcza parafii św. Proroka Eliasza objął ks. Anatol Fiedoruk, który funkcję sprawuje do dziś. A. Mironowicz, *Świątynie prawosławne na terenie miasta Białegostoku*, s. 108-110; tenże, *Cerkwie Białegostoku*, [w:] *Cerkwie Białegostoku w rysunkach Władysława Pietruka*, Białystok 1999, s. 3-8.

126 AAN, MWRiOP, sygn. 981, k. 135. W dokumencie stwierdza się, że została przejęta „w Dojlidach starożytna cerkiew nie wiadomo kiedy i przez kogo wybudowana". Tamże, k. 130-132.

127 AAN, MWRiOP, sygn. 1034, k. 86.

128 Zestawienie wykonano na podstawie: CAHL w Wilnie, f. 605, op. 1, nr 3665, k. 298-301; I. Matus, *Schyłek unii i proces restytucji prawosławia...*, s. 102, 105,

W latach 1919-1939 Dojlidy znajdowały się w powiecie białostockim województwa białostockiego II Rzeczypospolitej. Administracyjnie Dojlidy zostały włączone do Białegostoku. W czasie I wojny światowej dobra dojlidzkie nie tylko nie zostały zniszczone, ale dynamicznie się rozwijały[129]. Władze niemieckie zgodziły się również na odbudowę zdewastowanego podczas ewakuacji Rosjan browaru w Dojlidach. Nic więc dziwnego, że mając na uwadze opuszczenie majętności przez właścicieli, inspektor rolnictwa w białostockim Komisariacie Rządu A. Woźniacki 3 sierpnia 1919 r. wystąpił z wnioskiem o przejęcie majątku przez państwo. Stanowisko to poparł Główny Urząd Ziemski, żądając wprowadzenia w Dojlidach przymusowego zarządu państwowego. Ówczesny minister rolnictwa Franciszek Bardel 30 grudnia 1919 r. ustanowił nad dobrami dojlidzkimi zarząd państwowy. Wskutek błędów formalnych tej decyzji i wojny polsko-bolszewickiej decyzja Ministerstwa Rolnictwa i Dóbr Państwowych nie weszła w życie[130].

Po zakończeniu wojny hrabina Zofia Rüdiger pozostała w Berlinie, jeszcze w czasie wojny przyjmując obywatelstwo niemieckie. W 1918 r. hrabina odmówiła przyjęcia obywatelstwa polskiego. Mimo to, w myśl traktatu wersalskiego, hrabinie przysługiwało prawo własności do majątku pozostawionego w Polsce, w tym i do Dojlid. Z kolei prawo polskie dawało możliwości władzom państwowym przymusowego wywłaszczenia za odszkodowaniem właścicieli wszystkich majątków należących do osób pochodzenia niemieckiego. W 1919 r. Rüdigerowie postanowili pozbyć się Dojlid. Do lipca 1920 r. stan prawny Dojlid był nierozstrzygnięty. Dopiero ustawa o wykonaniu reformy rolnej z 15 lipca 1920 r., a zwłaszcza przepis o likwidacji majątków prywatnych obywateli niemieckich, dała możliwość przejęcia przez państwo dóbr dojlidzkich. Wobec wspominanych wyżej uchybień formalnych oraz niewpisania Dojlid do spisu dóbr, które miały zostać objęte zarządem przymusowym za odszkodowaniem dla właścicieli, Rüdigerowie nadal byli ich formalnymi posiadaczami. W tej sytuacji Rüdigerowie skorzystali z prawa sprzedaży w drodze dobrowolnej umowy. Nabywcą stała się instytucja parcelacyjna[131]. Zofia Rüdiger sprzedała Dojlidy Bankowi Ludowemu w Krakowie[132]. Na gruncie działalności prywatnego przedsiębiorstwa parcelacyjnego i serii uchybień prawno-formalnych na przełomie

107; *Памятная книжка Гродненской губернии на 1878-1890 год, 1904 год*, Гродно 1877-1889, 1904 oraz G. Sosna, *Bibliografia parafii prawosławnych na Białostocczyźnie. Część demograficzna*, Ryboły 1992, s. 18.

129 A. Miodowski, *Przewłaszczenia dóbr dojlidzkich...*, s. 14.

130 Tamże, s. 15-16.

131 Z. Landau, J. Tomaszewski, *Gospodarka Polski międzywojennej 1918-1939*, t. I: *W dobie inflacji 1918-1923*, Warszawa 1967, s. 163; A. Miodowski, *Przewłaszczenia dóbr dojlidzkich...*, s. 18-19.

132 A. Lechowski, *Białystok. Przewodnik historyczny*, s. 590.

1921/1922 r. wybuchła słynna afera dojlidzka[133]. Sprawa nabrała charakteru skandalu politycznego, w który zamieszani byli posłowie PSL „Piast".

Latem 1921 r. Polsko-Amerykański Bank Ludowy z siedzibą w Krakowie i powołane specjalnie w Krakowie Towarzystwo Przemysłowo-Leśne „Dojlidy" wystąpili z wnioskiem o zakup lasu i dóbr u Zofii Rüdiger. W myśl porozumienia Towarzystwo miało nabyć drzewostan, a Bank majątek dojlidzki. Pod wpływem nacisków politycznych Okręgowy Urząd Ziemski w Białymstoku 17 sierpnia 1921 r. udzielił zgody hrabinie Zofii Rüdiger na sprzedaż majątku dojlidzkiego, stanowiącego 12,5 tysiąca morgów powierzchni, spółce akcyjnej Polsko-Amerykańskiego Banku Ludowego w Krakowie za sumę 75 milionów marek polskich. O ile ta transakcja przeciągała się ze względów formalnych, to 31 sierpnia 1921 r. Towarzystwo Przemysłowo-Leśne „Dojlidy" nabyło w Berlinie od Zofii Rüdiger 10 tysięcy morgów (5 600 ha) lasów za cenę 1000 milionów marek polskich. Po licznych konfliktach, które trafiły na obrady sejmu, rozważano parcelację majątku dojlidzkiego. Ostatecznie 1 czerwca 1922 r. Okręgowy Urząd Ziemski w Białymstoku udzielił zgody na sprzedaż nabytych przez Polsko-Amerykański Bank Ludowy w Krakowie dóbr Dojlidy księciu Jerzemu Rafałowi Lubomirskiemu. Również Towarzystwo Przemysłowo-Leśne „Dojlidy" wydzierżawiło swój drzewostan księciu Lubomirskiemu uzyskując na nim ogromne zyski. W rezultacie transakcji przewłaszczeniowych z przełomu lat 1921/1922 władze, tuszując aferę i własne błędy, sprzedały Dojlidy księciu **Jerzemu Rafałowi Lubomirskiemu**[134]. Książę i parafia rzymskokatolicka, w oparciu o ustawę z 31 lipca 1923 r. o komasacji gruntów rolnych, wystąpili w 1926 r. o scalenie swych gruntów dojlidzkich[135]. Pod wpływem protestów mieszkańców wsi Dojlidy Główna Komisja Ziemska w Warszawie 22 grudnia 1927 r. odrzuciła protesty mieszkańców i doprowadziła do komasacji majątku Jerzego Lubomirskiego[136]. Orzeczeniem starosty powiatowego w Białymstoku z 30 września 1935 r. i 16 sierpnia 1937 r. akcją scaleniową objęte zostały grunty należące do księcia Jerzego Lubomirskiego i 40 ha gruntów „pocerkiewnych, znajdującymi się w użyt-

[133] Afera została szczegółowo opisana w pracach Adama Miodowskiego i Wiktora Bazylewskiego. Por.: A. Miodowski, *Przewłaszczenia dóbr dojlidzkich...*, s. 22-192 i tenże, *Przewłaszczenia dóbr dojlidzkich na przełomie 1921/1922 r.*, „Studia Podlaskie", 1997 t. VII, s. 97-112 oraz W. Bazylewski, *Sprawa Dojlid jako przyczynek do przeprowadzenia reformy rolnej na początku II Rzeczypospolitej*, „Najnowsze Dzieje Polski: materiały i studia z okresu 1914-1939", 1964, t. VIII, s. 19-47.

[134] A. Miodowski, *Przewłaszczenia dóbr dojlidzkich...,* s. 23-41.

[135] APwB, Wojewódzki Urząd Ziemski w Białymstoku, nr zesp. 76, sygn. 234, k. 89-89v.

[136] APwB, Wojewódzki Urząd Ziemski w Białymstoku, nr zespołu 76, sygn. 234, k. 11-12.

kowaniu parafii rzymskokatolickiej Dojlidy”[137]. Powyższy stan przetrwał do 1944 r., kiedy „władza ludowa” przejęła dobra dojlidzkie na Skarb Państwa.

Summary

St. Elijah’s Parish in Dojlidy up until 1939

Dojlidy is the oldest settlement within the borders of the city of Białystok. The first mention about the Orthodox parish in Dojlidy comes from 1571. It was founded by Hrehory Chodkiewicz, Voivode of Vilna, the Great Lithuanian Hetman.

The parish of the Nativity of the Virgin Mary in Dojlidy always had the status of an independent Orthodox parish church in the Białystok decanate. In 1828-50 the office of the parish priest in the Dojlidy parish was held by Onufry Gogolewski, who succeded in making the Uniates in Dojlidy return to the Orthodox Church in 1839. In 1856 Dojlidy was purchased by Baron Alexander Krusenstern, a senator in the Russian Empire. The new owner built a palace in the close vicinity of the church and founded a park around it. Before World War I, up until the evacuation in 1915, the position of the parish priest in Dojlidy was held by Father Aleksander Kaliszewicz. When the war ended, the Orthodox faithful began to return from the ‘exile’; however, in 1919 the Orthodox Church of the nativity of the Virgin Mary was not given back to the Orthodox community. The church, the belfry, the parish house and the land that belonged to the Orthodox parish in Dojlidy were unlawfully given by the authorities to the Roman Catholic parish.

Змест

Свята-Ільінскі прыход у Дайлідах да 1939 года

Дайліды — самы старажытны населены асяродак у межах горада Беластока. Маёнткі Беласток і Дайліды паміж 1437 і 1450 гг. ад Жыгімонта Кейстутавіча атрымаў Якуб Рачка Табутовіч (пам. 1463). Пасля смерці Якуба Рачкі маёнткі перайшлі ў спадчыну яго чатыром сынам. Яго старэйшыя сыны Мацей і Мікалай Юндзілы прадалі дайлідскую маёмасць у 1528 г. брэсцкаму старасту Аляксандру Хадкевічу, які валодаў ёю да 1549 г. Першыя звесткі пра дайлідскі прыход паходзяць з 1571 г. Царква ў гонар св. прарока Ілы была адзіным храмам на тэрыторыі дайлідскага і беластоцкага маёнткаў. Заснаваў яе ўладальнік дайлідскага маёнтка і Заблудава Рыгор Хадкевіч — віленскі ваявода, гетман Вялікага Княства Літоўскага. Гетман 21 чэрвеня 1571 г. замяніў зямельны надзел дайлідскаму святару Кузьму Дымітровічу (валоку і дзесяціну зямлі) у сяле Крыўляны на падобны ў Дайлідах.

Пасля смерці Рыгора Хадкевіча заблудаўскі маёнтак і Дайліды пераняў яго сын Аляксандр — гродзенскі староста, а пасля яго — Анна Сапяжанка з Хадкевічаў. Перад 1628 г. Дайліды апынуліся ў руках Крыштофа Радзівіла. Пасля Крыштофа Радзівіла заблудаўскую маёмасць атрымаў у спадчыну ягоны сын Януш Радзівіл (1612-1655), які здаў яе ў арэнду арыяніну Крыштофу Арцішэўскаму, а пасля Самуілу Мяжэнскаму. Яго сын Ян Мяжэнскі ў 1698 г. прадаў маёнтак Дайліды Стэфану Мікалаю Браніцкаму. У 1698-1808 гг. Дайліды належалі роду Браніцкіх. У 1807 г., згодна Тыльзіцкаму міру, Дайліды разам з Беластоцкай акругай адышлі да Расіі. Увесь час прыход Нараджэння ПДМ у Дайлідах меў статус самастойнай прыхадской царквы Беластоцкага благачыння. З 1815-1818 гг. маюцца звесткі пра настаяцеля дайлідскага прыхода. Быў ім сын Яна Красоўскага — Рыгор, а пасля яго з 1818 г. — ігумен

[137] APwB, Wojewódzki Urząd Ziemski w Białymstoku, nr zesp. 76, sygn. 234, k. 89-89v.

Юрый. У 1828-1850 гг. настаяцелем прыхода быў Ануфры Гагалеўскі, які ў 1839 г. вярнуў дайлідскіх уніятаў у праваслаўе. У 1856 г. Дайліды купіў барон Аляксандр Крузенштэрн. Новы ўладальнік па-суседску з царквой пабудаваў імпазантны палац, а вакол разбіў парк. У 1850 г. Аляксандр Крузенштэрн перадаў Дайліды дачцэ Сафіі (1840-1926) і яе мужу Іагану Фрыдрыху Рыдыгеру. Да Першай сусветнай вайны настаяцелем быў а. Аляксандр Калішэвіч, які нёс душпастырскую паслугу да бежанства 1915 г. Пасля заканчэння вайны бежанцы сталі вяртацца дамоў, але ў пачатку 1919 г. царква Нараджэння ПДМ дайлідскім вернікам не была вернута. Царкву Нараджэння ПДМ, званіцу, прыхадскі дом і зямлю праваслаўнага прыхода ў Дайлідах улады незаконна перадалі рымска-каталіцкай парафіі.

Antoni Mironowicz – prof. dr hab., pracownik naukowy Uniwersytetu w Białymstoku, kierownik Katedry Historii Europy Środkowo-Wschodniej. Tematyka badań: historia Kościoła wschodniego w Europie Środkowo-Wschodniej, stosunki narodowościowe i etniczne w Europie Środkowo-Wschodniej, kultura religijna społeczeństw pogranicza.

Віталь Гарматны
(Баранавічы)

Правядзенне камасацыі на тэрыторыі Віленскага ваяводства ў 1921-1939 гг.

Гістарыяграфія пытання

Камасацыя — гэта адна з галоўных складовых частак аграрнай рэформы, якая ажыццяўлялася польскімі ўладамі ў 1921-1939 гг. на землях II Рэчы Паспалітай, і найперш за ўсё Заходняй Беларусі (у тым ліку і Віленскага ваяводства) і Заходняй Украіны з мэтай ліквідацыі цераспалосіцы і інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі і ўяўляла сабою аб'яднанне раскіданых сялянскіх надзелаў з перанясеннем хат і стварэннем такім чынам хутара. Першыя падрыхтоўчыя мерапрыемствы па камасацыі былі ажыццёўлены на заходнебеларускіх землях яшчэ на працягу 1919 г., але сістэмнае яе правядзенне стала магчымым толькі пасля заключэння 18 сакавіка 1921 г. Рыжскага мірнага пагаднення.

Неабходна звярнуць увагу на адсутнасць вялікай комплекснай працы, прысвечанай непасрэдна правядзенню камасацыі ў Віленскім ваяводстве ў разглядаемы перыяд. У цэлым камасацыя разглядалася навукоўцамі ў кантэксце ажыццяўлення польскімі ўладамі аграрных пераўтварэнняў на землях Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг. Так, напрыклад, вядомы даследчык Ісаак Гальдштэйн[1] прааналізаваў з марксісцка-ленінскіх пазіцый існуючыя ў тагачаснай Заходняй Беларусі аграрныя адносіны, паказаў неабходнасць ліквідацыі цераспалосіцы ў асабістых сялянскіх гаспадарках і разам з тым крытыкаваў польскія ўлады, якія на яго думку праводзілі камасацыю выключна на карысць заможных сялян.

Найбольш поўна і падрабязна правядзенне камасацыі разгледжана ў працах Барыса Кухарава і Аляксея Сарокіна. Кухараў у сваім даследаванні[2] прасачыў развіццё сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг., паказаў асноўныя складовыя часткі ўрадавай аграрнай рэформы, у тым ліку і камасацыю, падкрэсліў яе цесную сувязь з меліярацыяй. Даследчык адзначыў, што надзелы большасці сялян Заходняй Беларусі былі раскіданымі, што істотна ўскладняла вядзенне асабістай сельскай гаспадаркі, таму ліквідацыя цераспалосіцы ста-

[1] И. И. Гольдштейн, *Аграрные отношения в бывшей Польше, Западной Украине и Западной Белоруссии*, Москва 1940.
[2] Б. Е. Кухарев, *Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919-1939 гг.)*, Минск 1975.

ла на пачатку 1920-х гг. жыццёванеабходнай. Разам з тым гісторык сцвярджаў, што камасацыя была выгадна найперш за ўсё мясцовым заможным сялянам і польскім уладам, таму заходнебеларускія сяляне выступалі рэзка супраць і ў выніку яна праводзілася пераважна прымусова. Гісторык падкрэсліў некаторае падабенства камасацыі і сталыпінскай аграрнай рэформы 1906-1914 гг. і адзначыў, што камасацыя праводзілася нераўнамерна (асабліва хутка яе рэалізацыя ішла з 1927 г.) і як вынік паскарала працэс класавага расслаення ў тагачаснай заходнебеларускай вёсцы, звярнуў увагу на некаторыя змены ў палітыцы камасацыі, падкрэсліў залежнасць тэмпаў камасацыі ад колькасці выдадзеных польскім урадам сялянам крэдытаў на перасяленне.

У працах А. Сарокіна прааналізавана правядзенне аграрнай рэформы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг., разглядаецца аграрнае заканадаўства II Рэчы Паспалітай і аграрнае пытанне ў праграмах тагачасных асноўных палітычных партый, але ўвага ў асноўным засяроджваецца на сялянскіх выступленнях супраць урадавай аграрнай палітыкі. Даследчык паказаў цесную сувязь камасацыі з ліквідацыяй сервітутаў, падкрэсліў, што лепшыя землі атрымлівалі заможныя сяляне. На думку Сарокіна, камасацыя садзейнічала пранікненню капіталу ў вёску, стабілізацыі і пашырэнню мясцовага буйнога зямельнага ўладання, ішла на карысць выключна шматзямельным гаспадарам, а для большасці сялян яна была сапраўдным няшчасцем з-за высокага кошту[3]. Як бачым, акрамя эканамічнага характару камасацыі, гісторык падкрэсліваў яе палітычны накірунак і нават ставіў яго на першае месца.

У зборніку *Польские крестьяне о своей жизни*[4] змешчаны ўспаміны сялянкі з Пастаўскага павета Віленскага ваяводства за 1933 г., якія сведчаць аб цяжкім лёсе мясцовага сялянства і вялікіх складанасцях, якія выклікала камасацыя, але варта адзначыць, што на той час перад савецкай гістарычнай навукай стаяла задача паказаць незвычайную беднасць заходнебеларускага і заходнеўкраінскага насельніцтва і неабходнасць уз'яднання гэтых зямель з Савецкім Саюзам, таму дакументы падабраны складальнікамі даволі тэндэнцыйна і аднабакова.

З польскіх даследчыкаў даследуемага перыяду неабходна ў першую чаргу назваць Станіслава Пачобута-Адляніцкага[5], які паказаў ажыццяўленне камасацыі на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства

[3] А. А. Сорокин, *Аграрный вопрос в Западной Белоруссии. 1920-1939 гг.*, Минск 1968, с. 95.

[4] *Польские крестьяне о своей жизни: письма крестьян*, изданные Институтом социальной экономики в Варшаве, под ред. и с пред. Я. Михальчука; пер. с пол. под ред. С. Бергмана, Москва 1936, с. 247-249.

ў 1921-1934 гг. і адначасова разгледзеў заканадаўчую базу хутарызацыі і прааналізаваў яе вынікі і значэнне. У азначаным даследаванні навукоўцам паказаны асноўныя праблемы тагачаснай заходнебеларускай сельскай гаспадаркі, якія ў многім характэрны былі і для Віленшчыны.

Сярод польскіх гісторыкаў перыяду Польскай Народнай Рэспублікі мэтазгодна адзначыць Чэслава Мадайчыка[6], які адпаведна марксісцкаленінскім падыходам разгледзеў аграрную рэформу ў II Рэчы Паспалітай, у тым ліку і правядзенне камасацыі, і ацэньваў яе адмоўна, падкрэсліваў, што ў выніку камасацыі бяднейшае сялянства разаралася яшчэ хутчэй з-за немагчымасці набыць дадатковую ворную зямлю.

У даследаванні Анджэя Зялінскага[7] паказана неабходнасць ажыццяўлення камасацыі ў сельскай гаспадарцы, разглядаецца заканадаўчае афармленне палітыкі камасацыі ў польскім заканадаўстве часоў II Рэчы Паспалітай і ПНР, прааналізаваны разнастайныя азначэнні тэрміна „камасацыя" з пункту гледжання юрыдычнай навукі.

Падводзячы вынікі, трэба зрабіць выснову, што правядзенне польскімі ўладамі камасацыі на землях Віленшчыны ў 1921-1939 гг. асветлена ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі даволі фрагментарна і павярхоўна, фактычна толькі акрэслена, разглядаецца пераважна ў агульным кантэксце аграрнай рэформы і яшчэ не стала прадметам для асобнага вялікага даследавання. Даследчыкі савецкага перыяду разглядалі камасацыю як неабходную і прагрэсіўную з'яву, якая мела на мэце ліквідацыю цераспалосіцы і паляпшэнне якасці апрацоўкі зямлі, але ацэньвалі яе рэалізацыю польскімі ўладамі адназначна негатыўна і сцвярджалі, што пры камасацыі лепшыя землі атрымлівалі заможныя сяляне, а для бедных яна была сапраўдным няшчасцем. Такім чынам, неабходная далейшая распрацоўка азначанага пытання беларускімі даследчыкамі з улікам патрабаванняў сучаснай гістарычнай навукі.

Варта падкрэсліць даволі вялікую розніцу ў падыходах навукоўцаў да непасрэднага вызначэння тэрміна „камасацыя" — адны з іх перш за ўсё падкрэсліваюць юрыдычныя мэты яе ажыццяўлення, а іншыя — тэхнічнага характару, перш за ўсё ў павышэнні агульнай сельскагаспадарчай культуры сялянства. У многіх выпадках „камасацыя" ўжываецца як сінонім тэрміна „ссяленне" (scalenie, з польскага „аб'яднанне зямель"). Такім чынам, можна выдзеліць дзве асноўныя групы тлумачэнняў тэрміна „камасацыя":

[5] S. Odlanicki-Poczobutt, *Województwo nowogródzkie*, Wilno 1936.
[6] C. Madajczyk, *Burżuazyjno-obszarnicza reforma rolna w Polsce (1918-1939)*, Warszawa 1956.
[7] A. Zieliński, *Scalanie gruntów w prawie polskim*, Poznań 1972.

1. З пункту гледжання яе канчатковага эфекту (перш за ўсё французскія даследчыкі К. Шаво, Х. Перо, М. Дзюмур'е і іншыя);
2. Акрамя эканамічнага аспекту, вылучаецца таксама і юрыдычны элемент: правядзенне замены надзелаў з кампенсацыяй.

У абедзвюх групах назіраюцца агульныя рысы:

1. Акрэсленне камасацыі як аперацыі, звязанай з ажыццяўленнем справядлівага памеру зямлі;
2. Азначаная мэта дасягаецца праз аб'яднанне ўсіх надзелаў, размешчаных на абшары камасацыі;
3. Канчатковы эфект камасацыі дасягаецца праз новы падзел нерухомасці, якая знаходзіцца на разглядаемым абшары[8].

У сувязі з гэтым аўтар артыкула прытрымліваецца наступнага асабістага тлумачэння: „камасацыя — гэта працэс аб'яднання раскіданых сялянскіх надзелаў з улікам іх грашовай вартасці, перанясення па магчымасці на новае месца хат і гаспадарчых пабудоў і стварэння такім чынам значнай колькасці хутароў з мэтай наступнай арганізацыі рацыянальнай сельскай гаспадаркі".

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Віленшчыны, колькасць і гушчыня насельніцтва ў 1921-1939 гг.

Плошча Віленскага ваяводства ў разглядаемы перыяд ахоплівала 29 011 км^2, што складала прыкладна 7,46% тэрыторыі міжваеннай Польшчы (глядзі табліцу 1). У склад Віленскага ваяводства ўвайшлі беларускія і часткова літоўскія землі з пераважна беларускім насельніцтвам, акрамя таго, у якасці найбольш шматлікіх этнічных груп можна адзначыць літоўцаў, палякаў і яўрэяў. Ваяводства падзялялася на Ашмянскі, Браслаўскі, Вілейскі, Віленскі гарадскі, Віленска-Троцкі, Дзісненскі, Маладзечанскі, Пастаўскі і Свянцянскі паветы. Адзіным буйным прамысловым і культурным цэнтрам быў горад Вільня (Wilno), які на 1937 г. налічваў 208 305 жыхароў (16,3% насельніцтва ваяводства).

Паводле перапісу 1931 г. у ваяводстве пражывала 1 275 269 чалавек, гушчыня насельніцтва на 1921 г. складала 34,6 жыхара на 1 км^2, а ў 1931 г. — 44,0. Варта падкрэсліць, што гушчыня насельніцтва ў параўнанні з сярэдняй па краіне была істотна меншай, але за дзесяць год паміж перапісамі прырост мясцовага насельніцтва склаў каля 27%, што было значна вышэй агульнадзяржаўнага.

[8] A. Zieliński, *Scalanie gruntów w prawie polskim*, s. 31-32.

Табліца 1. Плошча, колькасць і гушчыня насельніцтва Віленскага ваяводства (дадзеныя за 1931 г. і 1938 г.)[9]

Павет	Плошча, км²	Насельніцтва	
		Усяго, у тыс.	На км²
II Рэч Паспалітая	**388 634**	**32 107,3**	**83**
Віленшчына	**29 011**	**1 276,0**	**44**
Браслаўскі	4 217	143,1	34
Маладзечанскі	1 898	91,3	48
Дзісненскі	3 968	159,9	40
Ашмянскі	2 362	104,6	44
Пастаўскі	3 050	99,9	33
Свянцянскі	4 017	136,5	34
Вілейскі	3 427	131,1	38
Віленскі гарадскі	105	195,1	1 858
Віленска-Троцкі	5 967	214,5	36

Становішча сельскай гаспадаркі Віленскага ваяводства ў 1921-1939 гг.

На 1920 г. на ўсёй тэрыторыі II Рэчы Паспалітай пад час ваеннага ліхалецця знішчана 1 546 892 жылыя і сельскагаспадарчыя будынкі: з іх у Навагрудскім ваяводстве — 133 125, у Палескім — 129 063, у Віленскім — 28 023, усяго на абшарах Палескага, Навагрудскага, Валынскага і часткова Віленскага ваяводстваў знішчана 456 700 будынкаў (паводле іншых звестак — 558 260)[10]. На 1927 г. у ваяводстве ўзведзена 69 808 будынкаў, неабходна было аднавіць яшчэ 24 625. На 1921 г., напрыклад, у Свянцянскім і Ашмянскіх паветах, якія найбольш пацярпелі пад час баявых дзеянняў Першай сусветнай вайны, было цалкам знішчана 159 і 74 вёскі, часткова — 95 і 16 адпаведна; поўнасцю знішчана памешчыцкіх маёнткаў — 8 і 6, часткова — 24 і 20; не мелі хаты 2 147 і 829 сялянскіх гаспадарак, не мелі сельскагаспадарчых будынкаў і жылі ў прыстасаваных для пражывання пабудовах 2 497 і 773 сямей адпаведна[11]. За перыяд з 1 чэрвеня да 31 снежня 1921 г. на Віленшчыну вярнулася 7 510, а за 1922 г. — 22 152 бежанцаў Першай сусветнай вайны[12]. Неабходна адзначыць, што паводле ацэнак сучасных польскіх даследчыкаў Віленшчына на 1921 г. страціла больш 30% перадваеннага насельніцтва (на 1914 г.).

[9] Z. Tomczonek, *Ruch ludowy na kresach północno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej*, Białystok 1996, s. 15-17.

[10] *Historia chłopów polskich*, red. S. Inglot, t. 3: *Okres II Rzeczypospolitej i okupacji hitlerowskiej*, Warszawa 1980, s. 26.

[11] Z. Tomczonek, *Ruch ludowy na kresach północno-wschodnich...*, s. 19.

[12] *Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР: Документы и материалы*, т. 1: *1921-1929*, Минск 1962, с. 52.

Каля 88,6% жыхароў Віленшчыны паводле перапісу ад 30 верасня 1921 г. былі сялянамі, паводле звестак на 1931 г. — 73,0%[13]. Па стане на восень 1921 г. у Віленскім ваяводстве налічвалася 12,3% дробных сялянскіх гаспадарак з надзелам да 2 га, 7,6% — ад 2 да 5 га, 48,0% — ад 5 да 20 га; па II Рэчы Паспалітай — 37,7%, 33,8% і 26,0% адпаведна[14]. На канец 1921 г. на 100 чалавек насельніцтва ў Віленскім і Навагрудскім ваяводствах налічвалася 16,0 коней, 30,1 — галоў буйной рагатай жывёлы, 28,5 — свіней, авечак — 23,6; у той час як перад вайною (1912 г.) у Літве і Беларусі было 15,5; 32,5; 22,5 і 17,2 адпаведна[15].

Сяляне Віленшчыны ў сваёй большасці былі малазямельнымі і беззямельнымі, востра пакутавалі ад зямельнага дэфіцыту. Агульная сярэдняя ўраджайнасць у Віленскім ваяводстве была значна ніжэйшай у параўнанні з агульнадзяржаўнай, а па большасці паказчыкаў ніжэйшай нават у параўнанні з іншымі заходнебеларускімі ваяводствамі (аб чым сведчыць табліца 2), што было абумоўлена адносна невысокім узроўнем культуры апрацоўкі зямлі і слабым выкарыстаннем штучных угнаенняў. Напрыклад, на 1935 г. ужыванне паташнай солі ў Віленскім ваяводстве склала 870 тон, у Палескім — 501, у Навагрудскім — 416, у той час як у Познаньскім — 74 737.

Табліца 2. Сярэднія паказчыкі ўраджайнасці па ваяводствах у 1925-1929 гг. і ў 1931 г. (у цэнтнерах з 1 га)[16]

Культура	Віленскае		Навагрудскае		Палескае		II Рэч Паспалітая	
	1925-1929	1931	1925-1929	1931	1925-1929	1931	1925-1929	1931
Пшаніца	8,5	7,2	9,9	10,4	7,9	9,5	12,3	12,5
Жыта	6,7	4,8	8,8	7,3	9,8	7,1	10,9	9,9
Авёс	6,7	7,5	8,4	9,2	7,8	8,0	11,5	10,6
Лён насенне	4,3	3,1	5,5	5,5	6,3	5,4	5,9	4,8
Лён валакно	3,8	3,5	4,3	4,1	3,6	2,9	5,0	3,4
Бульба	77,0	91,0	109,0	99,0	79,0	84,0	107,0	114,0

У многіх выпадках аплату за сваю працу сяляне атрымлівалі прадуктамі, напрыклад, на пачатку 1920-х гг. у Дзісненскім павеце працаўнік зарабляў за месяц работы ў сельскай гаспадарцы заможнага аднавяскоўцы каля 7 пудоў жыта (112 кг, прыкладна 24,5 злотага). Калі ў заходнебеларускага селяніна з'яўляліся грошы, то ён іх укладваў перш за ўсё ў набыццё свойскай жывёлы ці дадатковага надзелу

[13] Z. Tomczonek, *Ruch ludowy na kresach północno-wschodnich...*, s. 21.
[14] *Wieś polska w latach wielkiego kryzysu, 1929-1935: materiały i dokumenty*, red. J. Ciepielewski, Warszawa 1965, s. 39.
[15] А. Смоліч, *Сялянства Заходняй Беларусі (Яго сучаснае палажэнне)*, [у:] *Заходняя Беларусь: зборнік*, Менск 1925, с. 35.
[16] Z. Tomczonek, *Ruch ludowy na kresach północno-wschodnich...*, s. 29.

ворнай зямлі. Асноўнымі артыкуламі грашовых затрат сталі выплата падаткаў, купля прамысловых тавараў і аплата царкоўных абрадаў. У многіх выпадках тавар у крамах і на рынках у гэты час сяляне не куплялі, а выменьвалі на прадукты[17].

У сельскай гаспадарцы рэгіёна захоўвалася шмат перажыткаў з часоў мінулага, але галоўным з іх была цераспалосіца. Паводле дадзеных сельскагаспадарчага перапісу, праведзенага польскімі ўладамі 30 верасня 1921 г., колькасць сялянскіх цераспалосных гаспадарак, у якіх налічвалася па 6-10 раскіданых невялікіх зямельных надзелаў, складала ў сярэднім па II Рэчы Паспалітай 23,5%[18]. Цераспалосіца падзялялася на ўнутраную (на абшары асобнай вёскі знаходзіліся надзелы толькі мясцовых сялян) і знешнюю (на абшары вёскі знаходзіліся надзелы сялян іншых вёсак)[19]. У некаторых выключных выпадках межы займалі да 10% надзелаў[20]. Так, калі гаспадарка абшарам 12 маргоў складалася з 10 надзелаў даўжынёю 500 метраў і шырынёю 1 метр, адпаведная колькасць межаў забярэ на гэтую мэту 50 квадратных метраў (амаль морг, каля 8%), не лічачы страт з-за складанай сістэмы даезду, выкліканай існуючай канфігурацыяй надзелаў[21].

Гаспадаранне на некалькіх, а часта нават на дзясятках надзелаў зямлі, адлеглых ад сябе часам на дыстанцыю ў кіламетры, было вялікаю і марнаю стратаю сіл і часу селяніна[22]. Наяўнасць цераспалосіцы можна растлумачыць хуткім драбненнем сялянскіх гаспадарак з-за высокага натуральнага прыросту і немагчымасцю набыць зямлю ў адным месцы з-за яе дэфіцыту і высокага кошту. Варта звярнуць увагу, што ступень цераспалосіцы знаходзілася ў цеснай залежнасці ад прыросту мясцовага насельніцтва[23].

[17] В. С. Мисиюк, *Экономические условия модернизации крестьянского хозяйства Западной Белорусии (1921-39 гг.)*, [у:] *Славянские страны в условиях системной трансформации и европейской интеграции. Сборник научных трудов кафедр социо-гуманитарных наук*, Брест 2005, с. 95.

[18] И. И. Гольдштейн, *Аграрные отношения в бывшей Польше...*, с. 196.

[19] S. Odlanicki-Poczobutt, *Województwo nowogródzkie*, s. 421.

[20] *Аграрный вопрос и крестьянское движение: справочник*, под общ. ред. М.П. Горова, Москва 1935, т. 2: *Польша; Литва; Эстония; Финляндия; Греция; Болгария; Румыния; Югославия*, с. 19.

[21] E. Libański, *Zasady parcelacji i komasacji z dodatkiem instrukcji technicznej GUZ (wedle wykładów w państwowej szkole mierniczej we Lwowie)*, Lwów 1922, s. 17.

[22] Archiwum Akt Nowych (dalej: AAN), Zespół 323, Akta Kazimierza Lewińskiego, sygn. 12, k. 31. Działalność BBWR w zakresie prac gospodarczo-społecznych na terenie województwa poleskiego. Sprawozdania ze zjazdów, okólnik, komunikaty polityczno-gospodarcze, 1933-1935; J. Kania, *Obecny stan rolnictwa w Polsce*, Warszawa 1926, s. 10.

[23] W. Ormicki, *Życie gospodarcze Kresów Wschodnich Rzeczypospolitej Polskiej*, Kraków 1929, s. 74.

Як падсумоўвалася ў рэдакцыйным артыкуле „Балючае пытанне нашай вёскі” сельскагаспадарчага часопіса „Саха” (1927, № 5, с. 1): „Наша вёска вельмі мала падатная на які-небудзь поступ у сельскай гаспадарцы, на яе паляпшэньне, дык па драбненьню і без таго дробных нашых гаспадарств, мы, пэўна, стаім на першым месцы сярод іншых народаў. Дробныя бядняцкія гаспадаркі, дзякуючы частым падзелам растуць у нас, як грыбы пасьля дажджу. Каб ня быць галаслоўным і каб падкрэсьліць гэтую думку, прывожу прыклад з вядомай мне вёскі (Рымкі, Пастаўскага павета), дзе ў 1920 г. было ўсяго 22 гаспадаркі, а ў 1926 г. — 39. Як бачым, за 6 гадоў утварылася амаль у два разы больш гаспадарак. Усе новастворыныя гаспадаркі самыя бядняцкія і рэдка якія маюць 3 дзесяціны зямлі”[24].

Каля 40% сялянскіх гаспадарак усходніх ваяводстваў мелі некаторыя зямельныя надзелы шырынёю 1-2, а 14% гаспадарак — менш 1 метра ў шырыню, з-за гэтага на такіх надзелах селяніну з канём было цяжка нават развярнуцца. Акрамя таго, пры захаванні цераспалосіцы паміж суседзямі часта адбываліся спрэчкі і нават бойкі па праве валодання асобнымі надзеламі[25]. Самі польскія дзяржаўныя дзеячы адзначалі, што падобная сітуацыя ў землекарыстанні назіралася раней і ў краінах Заходняй Еўропы, але там аб’яднанне сялянскіх зямельных надзелаў адбылося значна раней: у Прусіі — у 1823 г., у Аўстрыі — у 1848 г., у Расійскай Імперыі — часткова ў 1861-1864 гг. і г.д., у той час як у міжваеннай Польшчы камасацыю неабходна было шмат дзе правесці[26].

Заканадаўчая база ажыццяўлення камасацыі

Падрыхтоўка да правядзення ў Заходняй Беларусі камасацыі распачалася ў 1921 г. (адразу пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавору), і напачатку ажыццяўлялася паводле нормаў даваеннага расійскага заканадаўства. 20 сакавіка 1922 г. выдадзена пастанова Рады Міністраў ІІ Рэчы Паспалітай, згодна якой ліквідаваліся акруговыя дэлегатуры, замест якіх ствараліся акруговыя зямельныя ўправы на чале са старшынямі, выконваючымі адначасова функцыі старшынь ваяводскага зямельнага аддзела. У адпаведнасці з ёю 11 студзеня 1923 г. створана Віленская акруговая зямельная ўправа (Wileński Okręgowy Urząd Ziemski, ВАУЗ).

[24] Б. Е. Кухарев, *Сельское хозяйство Западной Белоруссии...*, с. 43.
[25] W. Krzyżanowski, *Scalanie gruntów*, Tarnopol 1928, s. 6.
[26] K. Konopka, *Mechanizm reform agrarnych w Drugiej Rzeczypospolitej Polskiej*, 1918-1939, Białystok 2010, s. 120.

Камасацыя, паводле меркаванняў прадстаўнікоў значнай часткі польскай эліты, павінна была стаць галоўнай складовай часткай ажыццяўляемай аграрнай рэформы: напрыклад, 14 чэрвеня 1923 г. у Сейме абвяшчалася, што „камасацыйны закон на шляху да рацыянальнай сельскай гаспадаркі трэба трактаваць найперш за ўсё як падмурак, як фундамент”[27]. Паводле ацэнак тагачасных даследчыкаў усяго ў II Рэчы Паспалітай неабходна было скамасаваць ад 9 млн. да 14 млн. га.

У адпаведнасці з прынятым 31 ліпеня 1923 г. Сеймам II Рэчы Паспалітай законам аб камасацыі (scaleniu, ссяленні) надзелы аднаго ўладальніка, даўжыня якіх у адносінах да шырыні складала менш як 15 разоў, аддзеленыя ад сябе надзеламі іншага ўладальніка, лічыліся раздробленымі і цераспалоснымі і падлягалі звядзенню ў адзін, адпавядаючы асновам справядлівага гаспадарання (артыкул 1), з пераняўсеннем сюды хаты і стварэннем такім чынам хутара. Ад правядзення ссялення пазбаўляліся лясы, што знаходзіліся ў карыстанні лясной гаспадаркі, і ў адносінах да якіх не было спрэчкі аб усталяванні межаў; землі, на якіх размяшчаліся каменяломні альбо вялася здабыча мінералаў; землі, якія належалі гутам (шклозаводам) і шахтам; землі, на якіх размяшчаліся радовішчы нафты і г.д., маглі падлягаць ссяленню толькі са згоды ўладальніка; землі, на якіх знаходзіліся помнікі гісторыі, архітэктуры, прыроды і г.д. (артыкул 2)[28].

Без згоды ўладальніка пад ссяленне не падпадалі землі пад будынкамі і падворкамі; землі, якія належалі прамысловым прадпрыемствам; землі, якія знаходзіліся ў гарадах і мястэчках, і на якіх планавалася распачаць будаўнічыя работы; землі, якія патрэбны для вядзення гаспадаркі, а таксама пад вадаёмамі, якія выкарыстоўваліся для развядзення рыбы альбо для прамысловых мэт, і замена ці перамена спосабу выкарыстання якіх наносіла ўладальніку шкоду; агароды і сады, якія вяліся планава, паркі і звярынцы; землі з залежамі торфу; землі, абнесеныя сцяною; вінаграднікі альбо хмельнікі плошчаю не менш 1/4 га (артыкул 3). Землі, якія ва ўмовах свайго месцазнаходжання маглі выклікаць небяспеку праз засыпванне, абрыў берагоў і г.д., таксама вызваляліся ад ссялення (артыкул 4). Пералічаныя ў артыкуле 1 землі ўтваралі абшар ссялення, які мог адпавядаць адміністрацыйнай адзінцы ці складаць яе частку. У выпадку неабходнасці абшар ссялення мог складаць некалькі адміністрацыйных адзінак альбо іх частак (артыкул 5). Кожны з удзельнікаў ссялення атрымліваў з абша-

[27] W. Mich, *W obliczu wywłaszczenia. Kwestia reformy rolnej w publicystyce ziemiańskiej 1918-1939*, Lublin 2001, s. 126.

[28] Ustawa z dnia 31.07.1923 r. o scalaniu gruntów, „Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej” (dalej: DURP, 1923, nr 92, poz. 718, s. 1050-1056.

ру ссялення надзел зямлі, прыкладна роўны папярэдняму з улікам грашовага каэфіцыента (артыкул 6).

Ініцыятарамі ажыццяўлення аб'яднання зямель маглі быць уладальнікі не менш як 25 га, падпадаючых пад артыкул 1, а калі абшар ссялення не перавышаў 200 га — то ўласнікі не менш 1/10 зямлі (артыкул 14). Просьбы аб ссяленні падаваліся ў павятовую зямельную ўправу, якая павінна была на месцы высветліць сапраўдны стан рэчаў, і — у выпадку патрабаванняў іншых органаў улады — запраектаваць абшар ссялення, які з гаспадарчых і тапаграфічных поглядаў належыць праводзіць адначасова (артыкул 15). Пасля гэтага просьбу вяскоўцаў аб ссяленні разглядала павятовая зямельная ўправа, якая на сваім пасяджэнні згодна кадастравым кнігам зацвярджала абшар камасацыі, альбо адвяргала яго (артыкул 16). Правадзейнае рашэнне акруговай зямельнай камісіі павінна было быць даведзена да ведама ўсіх бакоў і шырокай грамадскасці (артыкул 17).

На падставе рашэння аб правядзенні ссялення і пастановы акруговай зямельнай управы зямельны камісар для кожнай ніжэйшай адміністрацыйнай адзінкі вызначаў асобныя выбары рады (савета) удзельнікаў ссялення (rada uczestników scalenia), а ўладальнікі памешчыцкіх зямель вылучалі свайго прадстаўніка. Колькасць членаў рады залежала ад колькасці сялян вёскі і складала ад 3 да 7 членаў, у дапамогу якім выбіраліся намеснікі (zastępcy), колькасцю роўнаю колькасці членам рады (артыкул 18). Сход удзельнікаў ссялення ініцыяваў і ўзначальваў войт гміны альбо солтыс (стараста) вёскі. На сходзе павінны былі прысутнічаць не меш 1/2 асоб, якія мелі права голасу, рашэнні прымаліся звыклаю большасцю галасоў.

У выпадку сумеснага карыстання зямлёю на сход вылучалася адна асоба з ліку гаспадароў, а ў выпадку калі згода не будзе дасягнута: з ліку паўнамоцных уладальнікаў — старэйшы па ўзросце, ад не маючых права голасу — іх законны прадстаўнік, ад загінулых — вызначаны судом куратар, ад адсутнічаючых — упаўнаважаны зямельным камісарам, у выпадку немагчымасці прысутнасці ўладальнікаў — асоба, спецыяльна вызначаная судом па прапанове зямельнага камісара. У выпадку спрэчак па ўладальніку зямлі за ўпаўнаважанага да галасавання належаў апошні па часе ўладальнік зямлі (артыкул 19)[29].

У выпадку невыканання ў тэрміне 14 дзён, вызначаным зямельным камісарам, выбару членаў рады ссялення і іх намеснікаў, акруговая зямельная ўправа вызначала іх самастойна па прапанове зямельнага камісара. Пры сцвярджэнні, што дзейнасць асобных членаў альбо ўсёй

[29] *Zbiór przepisów o scalaniu gruntów*, zebr. i oprac. H. Maciejewski, Białystok 1938, s. 50-52.

рады ссялення неадпаведная для вызначаных законам для ссялення мэт, акруговая зямельная ўправа магла прапанаваць зямельнаму камісару вызваленне ад абвязкаў асобных членаў рады ссялення ці яе поўны роспуск. У такіх умовах акруговая зямельная ўправа прызначала новыя выбары, альбо вызначала з ліку ўдзельнікаў ссялення новых членаў рады (артыкул 20)[30].

У залежнасці ад абставін рада ссялення валодала рашаючым ці дарадчым голасам. Рада ссялення мела рашаючы голас, калі справа ішла аб усталяванні межаў выдзяляемых зямельных надзелаў, лугоў, лясоў і г.д., што раней належалі ўсёй вёсцы; у выбары членаў ацэначнай камісіі (komisji szacunkowej), якая вызначала каэфіцыент ураджайнасці і грашовай вартасці камасаваных зямель; удзеле хутаран у судзе і іншых камісіях, якія разглядалі пытанне правядзення ў вёсцы камасацыі; утварэнні камісіі па меліярацыі; завярэнні ўмовы на выкананне работ па меліярацыі; вызначэнні розных гаспадарчых і адміністрацыйных пытанняў; патрэбе замены грунтоў з мэтаю ўпарадкавання зямельных межаў і скасавання „анклаваў" (надзелаў аднаго гаспадара, аддзеленых ад сябе з усіх бакоў надзеламі іншых гаспадароў).

Дарадчы голас рада ссялення мела пры ўсталяванні землямерам межаў камасаваных грунтоў; вызначэнні з ліку ўдзельнікаў ссялення гаспадарак, якія маюць патрэбу ў дадатковай зямлі; вызначэнні зямель, якія не падлягаюць камасацыі; праектаванні накірунку дарог, якія вядуць да новых надзелаў і каля якіх будуць стаяць гаспадарчыя будынкі; узгадненні з землямерам і акруговай зямельнай управай праекта ссялення; усялякіх іншых справах, якія ўзнікалі пад час работы землямера[31].

У функцыі рады ссялення ўваходзілі дапамога і нагляд за правядзеннем землямерам работ па камасацыі і адпаведнасцю выдзяляемых сялянам надзелаў, падбор рабочых з ліку мясцовых сялян для дапамогі землямеру ў выкананні неабходных работ. Ажыццяўляць сваю дзейнасць рада ссялення павінна была ў рамках дзеючага заканадаўства пры выказванні ўласных пажаданняў. За ігнараванне сваіх абавязкаў ці нядбайнае іх выкананне членам рады ссялення пагражаў вялікі штраф (артыкул 21).

Для ацэнкі грашовай вартасці сялянскіх зямель пры ссяленні стваралася ацэначная камісія, у склад якой уваходзілі зямельны камісар або падкамісар, спецыяльна дэлегаваны акруговаю зямельнаю ўправаю ў якасці старшыні; землямер, які праводзіў работы па ссяленню, і мінімум трое асабіста незацікаўленых у выніках ссялення асоб, веда-

[30] Ustawa z dnia 31.07.1923 r. o scalaniu gruntów, DURP, 1923, nr 92, poz. 718, s. 1050-1056.

[31] *Zbiór przepisów o scalaniu gruntów*, s. 55-56.

ючых мясцовыя зямельныя адносіны. Пры вырашэнні камісіяй спрэчных пытанняў дарадчы голас мелі члены мясцовай рады ссялення, дэлегаты іншых навакольных рад, якія знаходзіліся ў гэтай жа адміністрацыйнай адзінцы, — па два ад кожнай рады, прадстаўнік ссяляемых памешчыцкіх зямель — па аднаму ад кожнага надзела. Вынікі працы камісіі павінны былі быць зафіксаваны ў пратаколе і на плане, змешчаным у справе ссялення (артыкулы 25, 26)[32].

Камасацыя праводзілася з памерам старога стану зямлі ці без яго землямерам, вызначаным зямельнаю управаю і ўпаўнаважаным на падставе закона ад 15 ліпеня 1925 г. Памер зямлі праводзіўся ў тых выпадках, калі не існавала кадастравага плана з мэтай устанавіць, дзе і колькі зямлі мае кожны ўдзельнік ссялення. У выпадку існавання адпавядаючага рэчаіснасці памярова-ацэначнага рэестра землямерам на яго аснове складаўся план ссялення з вопісам кожнага класа зямлі ў дадзенай мясцовасці, магчымай урадлівасці збожжавых, сена, дрэва альбо выпасу колькасці галоў свойскай жывёлы (у залежнасці ад ужытку). На план наносіліся ўсялякія межы класаў і ўжыткаў, нумараваліся ўсе існуючыя класіфікацыйныя контуры[33].

Пры правядзенні камасацыі ў выпадку неабходнасці ажыццяўлялася ліквідацыя ўсялякіх сервітутаў (права сялян і памешчыкаў сумеснага карыстання зямельнымі ўгоддзямі); падзел зямель, ці, у выпадку немагчымасці з гаспадарчых альбо тапаграфічных прычын, — урэгуляванне іх карыстання; усталяванне межаў адміністрацыйных адзінак альбо іх частак; выдзяленне зямель на грамадскія мэты; меліярацыя ссяляемых зямель для іх рацыянальнага выкарыстання; рэгуляцыя дарог, даездаў праз давядзенне іх да стану звычайнага карыстання; парцэляцыя (падзел) прыватных маёнткаў у межах закону аб аграрнай рэформе, калі таго патрабавалі гаспадарчыя патрэбы ссяляемых зямель; усталяванне агульнага плана забудавання, складзенага на падставе ссялення адміністрацыйнай адзінкі (артыкул 7).

Правядзенне ссялення належала да кампетэнцыі зямельных упраў (артыкул 9). Тэхнічнае ажыццяўленне камасацыі зямельныя ўправы даручалі дзяржаўным альбо прыватным землямерам, якія валодалі адпаведнаю кваліфікацыяй. Кантроль над правядзеннем ссялення ажыццяўляў старшыня Галоўнай зямельнай управы ІІ Рэчы Паспалітай (ГЗУ, Główny Urząd Ziemski, артыкул 10), створанай 22 ліпеня 1919 г. Непасрэднымі выканаўцамі кантролю былі ваяводскія зямельныя ўправы, а дапаможнымі — павятовыя ўправы. Нагляд за ссяленнем зямельныя

[32] Ustawa z dnia 31.07.1923 r. o scalaniu gruntów, DURP, 1923, nr 92, poz. 718, s. 1050-1056.

[33] K. Kasiński, *Komasacje gruntów wiejskich*, Warszawa 1929, s. 2, 4.

ўправы праводзілі бясплатна, а пералічаныя ў артыкуле 7 работы — платна ў адпаведнасці з вызначанымі тарыфамі. У выпадках, калі гаспадар надзела не мог аплаціць неабходныя работы і гэта пацвярджалі мясцовая гмінная ўправа і павятовае староства, яму мог быць выдадзены крэдыт тэрмінам на 5 гадоў на частковую ці поўную аплату работ альбо наогул улады маглі зняць з яго аплату ці вызваліць ад зямельнага падатку на 2 гады. Працэнтная стаўка па крэдыце складала ад 4% да 100% штогод (артыкул 11). Сяляне, якія павінны былі ў вызначаныя зямельнымі ўправамі тэрміны перанесці свае будынкі на новыя надзелы альбо правесці меліярацыю зямель, не маглі атрымаць крэдыт, які перавышаў палову кошту ссяляемых зямель. Выдачу крэдытаў ажыццяўляў міністр фінансаў па ўзгадненні са старшынёю ГЗУ (артыкул 13)[34]. Неабходна адзначыць, што па ацэнках сучаснікаў, кошт пераносу будынкаў складаў у сярэднім па 50-150 злотых з 1 га (для малазямельных звычайна кошт быў у 2,5 разу вышэй)[35].

У сувязі з вялікімі цяжкасцямі першапачаткова камасацыя праходзіла даволі марудна, а масава яна стала праводзіцца пасля выхаду ў свет сумеснага распараджэння Міністэрстваў сельскагаспадарчых рэформ (Ministerstwo Reform Rolnych, МСГР) і фінансаў ад 14 студзеня 1927 г. аб выдачы хутаранам ільготных крэдытаў[36]. Дзяржаўная крэдытная дапамога сялянам выдзялялася з фондаў МСГР у форме дадатковых банкаўскіх пазык пад 4% гадавых (артыкул 3). Уладальнікам новастворaных хутарскіх гаспадарак выдаваўся крэдыт у 1 200 (у выключных выпадках да 2 500) злотых на перанясенне будынкаў і 600 (800) злотых на меліярацыю (артыкул 4), а малазямельным гаспадарам на набыццё дадатковай ворнай зямлі. Высокасць пазыкі на 1 га новаатрыманага надзела не магла перавышаць сярэднерынкавага кошту зямлі ў дадзенай мясцовасці (артыкул 5). Агульная сума крэдыту на набыццё зямлі на гаспадарку не магла быць больш паловы сукупнага кошту надзелаў селяніна (артыкул 6). Крэдыты выдаваліся пад іпатэчнае забеспячэнне нерухомасцю на тэрмін да 15 гадоў, а на тэхнічныя работы — да 4 гадоў (артыкул 9).

Велічыня пазыкі ў адносінах да 1 га новаатрыманага надзела не магла перавышаць сярэднерынкавага кошту зямлі ў наваколлі (артыкул 5). Агульная сума крэдыту на набыццё зямлі на 1 гаспадарку не магла быць больш паловы сукупнага кошту ўсіх надзелаў селяніна

[34] Ustawa z dnia 31.07.1923 r. o scalaniu gruntów, DURP, 1923, nr 92, poz. 718, s. 1050-1056.

[35] C. Madajczyk, *Burżuazyjno-obszarnicza reforma rolna w Polsce...*, s. 241.

[36] Rozporządzenie Ministra Reform Rolnych z dnia 14.01.1927 r. wydane w porozumieniu z Ministrem Skarbu o państwowej pomocy kredytowej przy scalaniu gruntów, DURP, 1927, nr 6, poz. 36, s. 45-47.

(артыкул 6)[37]. Крэдыты выдаваліся пад іпатэчнае забеспячэнне нерухомасцю на тэрмін да 15 гадоў, а на тэхнічныя работы — да 4 гадоў (артыкул 9). У выпадку неўраджаю, пажару альбо іншага стыхійнага бедства, смерці альбо цяжкай хваробы хутараніна, выплата крэдыту магла быць адтэрмінавана на 2 гады (артыкул 12). Пры афармленні крэдыту на камасацыю селяніну неабходна было заплаціць першапачатковы ўнёсак, а потым кожнае паўгоддзе (1 красавіка і 1 кастрычніка) выплачваць суму асноўнага доўгу роўнымі далямі з працэнтамі. Гербавы збор пры гэтым звычайна складаў 7 злотых 20 грошаў, яго патрэбна было заплаціць на працягу месяца з дня пераафармлення зямлі[38]. Паводле пастановы ад 24 лютага 1928 г. крэдыты выдаваліся перш за ўсё тым сялянам, якія пераносілі на новае месца будынкі.

6 чэрвеня 1935 г. выдадзена распараджэнне МСГР аб кошце работ па камасацыі. Паводле вызначаных тарыфаў плата за камасацыю 1 га зямлі складала ў паўднёва-заходняй частцы Віленскага (Маладзечанскі, Ашмянскі, Свянцянскі і Віленска-Троцкі паветы) з памерам старога стану зямлі — 20, без памеру — 15 злотых; у паўночна-ўсходняй частцы Віленскага ваяводства (Браслаўскі, Дзісненскі, Пастаўскі і Вілейскі паветы) 18 і 15 злотых адпаведна (артыкул 1.1.)[39].

Ажыццяўленне мерапрыемстваў па камасацыі ў 1921-1939 гг.

Сяляне Віленшчыны ў сваёй большасці шмат пакутавалі ад вялікай цераспалосіцы, лічылі, што пры яе ажыццяўленні „можа трохі і лепей будзе", і таму падтрымлівалі правядзенне камасацыі[40]. Варта звярнуць увагу, што істотнай перашкодай на шляху камасацыі сталі і псіхалагічныя прычыны: сялянам было цяжка адразу перайсці з уласнай зямлі, якую яны атрымалі па спадчыне ад дзедаў і прадзедаў, на новае і яшчэ неасвоенае месца[41]. Як пісаў у сувязі з гэтым тагачасны

[37] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці, ф. 372, воп. 1, спр. 189, арк. 5. Циркуляры Министерства земельных реформ о проведении хуторизации земель (1926-1931 гг.)

[38] Rozporządzenie Ministra Reform Rolnych z dnia 14.01.1927 r. wydane w porozumieniu z Ministrem Skarbu o państwowej pomocy kredytowej przy scalaniu gruntów, DURP, 1927, nr 6, poz. 36, s. 45-47.

[39] Rozporządzenie Ministra Rolnictwa i Reform Rolnych z dnia 6.06.1935 r. wydane w porozumieniu z Ministrem Sprawiedliwości o opłatach za scalenie gruntów i zniesienie służebności oraz za odrysy dowodów pomiarowych, DURP, 1935, nr 43, poz. 290, s. 746-751.

[40] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НАРБ), ф. 242п, воп. 1, спр. 297, арк. 22. Материалы о работе в деревне

[41] *Гарады і раёны Берасцейшчыны: гісторыя і сучаснасць. Івацэвіцкі раён*, Брэст 2009, с. 136.

польскі даследчык Ян Бялецкі (Jan Bielecki), „дзякуючы камасацыі і меліярацыі планавалася павысіць прыбытковасць дробных (сялянскіх) гаспадарак. Без ссялення не можа ісці гаворкі аб паляпшэнні ўраджайнасці і павелічэнні колькасці свойскай жывёлы. У Заходняй Еўропе дробныя гаспадаркі ўжо даўно скамасаваны, так і землі былыя прускія (якія раней знаходзіліся пад уладай Прусіі) таксама не ведалі цераспалосіцы... Меліярацыя і ссяленне праводзяцца ў Польшчы не такімі хуткімі тэмпамі, як хацелася б. Прычына — страх сялян атрымаць (пры камасацыі) горшую (чым раней) зямлю. Селянін у цэлым свеце ёсць кансерватар і не любіць „навінак". (Для паляпшэння сітуацыі) трэба выдаваць спецыяльныя кнігі, брашуры"[42]. Акрамя таго, паводле меркаванняў тагачасных інжынераў, пры правядзенні камасацыі было б вельмі пажадана пры планаванні аб'яднання надзелаў карлікавых гаспадарак па магчымасці сканцэнтраваць іх у адным месцы, звычайна на памежжы дзвюх і больш гмін. У такім выпадку ўтварыўся б больш населены асяродак, які мог бы стаць пачаткам новай вёскі ці нават мястэчка[43].

Як адзначаў сучаснік падзей Станіслаў Пачобут-Адляніцкі, „цераспалосіца забірае ў сялян не толькі час, але і зямлю, павялічваючы памер няўжыткаў. Кожны шнур (вузкі надзел), які з'яўляецца індывідуальнай уласнасцю гаспадара, аддзелены ад іншых шырокай баразной альбо вузкай мяжой..., пераважна мяжой, шырынёй каля 1/3 метра, па абодва бакі якой знаходзяцца дзве баразны, у выніку чаго агульная шырыня мяжы паміж суседнімі шнурамі складае каля 1/2 метра"[44]. На першы погляд, як піша даследчык, гэта не мае асаблівага гаспадарчага значэння, але калі падлічыць колькасць зямлі пад межамі, то можна адзначыць, што ў сярэднім яна складала каля 3%, чаго хапіла б на надзяленне зямлёю многіх мясцовых малазямельных сялян.

У камасацыі сяляне бачылі магчымы сродак паляпшэння асабістага матэрыяльнага становішча і таму гэтая справа мела асаблівае значэнне, патрабавала пільнай увагі з боку дзяржавы. Так, 7 кастрычніка 1926 г. Дырэкцыя дзяржаўных лясоў у г. Вільня звярталася ў МСГР з просьбай пры ажыццяўленні камасацыі перадаць на надзяленне зямлёю сялян гміны Крэва Ашмянскага павета лясны абшар памерам 32,4 га, які з пункту гледжання лясной гаспадаркі гаспадарчага зна-

[42] J. Bielecki, *Młodzież a reforma na wsi*, Warszawa 1930, c. 29-30.
[43] W. Kępiński, *Komasacja jako podstawa naprawy ustroju rolnego*, Kraków 1927, s. 33.
[44] S. Odlanicki-Poczobutt, *Województwo nowogródzkie*, s. 425-426.

чэння не мае, але мае вялікае значэнне ў справе надзялення зямлёю сялян суседніх вёсак. Просьба сялян уладамі была задаволена[45].

16 снежня 1927 г. глыбоцкі павятовы стараста звяртаўся да віленскага ваяводы з просьбаю аб надзяленні сялян вёсак Язненскай гміны зямлёю, бо гэта мела як важнае гаспадарчае, так і вялікае палітычнае значэнне. Язненская гміна знаходзілася непадалёку ад савецкай мяжы і там назіраўся вялікі зямельны голад і значны ўплыў камуністаў на мясцовае насельніцтва, якое „беднае і цёмнае, ...і прыслухоўваецца да таго, хто больш абяцае". Сітуацыю можна было б выправіць праз надзяленне зямлёю мясцовага бяднейшага сялянства, што і было надалей польскімі ўладамі ажыццёўлена[46].

19 студзеня 1928 г. сяляне вёскі Калінаўка гміны Мядзель Пастаўскага павета звярнуліся ў ВАУЗ з просьбаю аб камасацыі: „Мы ўсе жадаем і чакаем як мага хутчэйшага распачынання і скамасавання нашых зямель, бо нам ужо немагчыма жыць без камасацыі, бо землі нашыя ў вузкіх шнурах і на вялікай адлегласці размешчаны, з-за чаго таксама немагчыма жыць, а калі скамасаваць нашы землі на хутарскія калоніі (надзелы), то кожны з нас мог бы жыць прыстойна, акрамя таго, наша вёска знішчана агнём у 1924 годзе і да гэтага часу чакаем хутароў, будынкі ўжо падрыхтаваныя, але няма магчымасці іх узвесці і няма дзе ставіць хаты, бо надзелы (нашыя) вузкія і іншых магчымасцяў няма, таму мы знаходзімся ў крытычным стане..."[47]. Просьба сялян вёскі Калінаўка аб камасацыі ўладамі была задаволена.

Працэс камасацыі быў доўгім і складаным у сувязі з неабходнасцю правядзення вялікага аб'ёму падрыхтоўчых работ і складання шматлікіх патрабуемых дакументаў, акрамя таго заходнебеларускія сяляне спадзяваліся атрымаць пры ссяленні дадатковую ворную зямлю, але ва ўрада адсутнічаў дастатковы запас свабодных зямель. Паводле ацэнак тагачасных польскіх даследчыкаў для ажыццяўлення работ па камасацыі асобнай вёскі неабходна было як мінімум паўтара-два гады, у першую чаргу для падрыхтоўкі патрэбнай нарматыўна-прававой і тэхнічнай дакументацыі і, пры магчымасці, па надзяленні дадатковай ворнаю зямлёю мясцовых беззямельных і малазямельных сялян, а таксама тых, якія пераносілі на новае месца асабістыя гаспа-

[45] AAN, Zespół 13, Ministerstwo Rolnictwa i Reform Rolnych, 1918-1939, sygn. 5856, k. 41. Odstąpienie państwowych gruntów na cele reformy rolnej.

[46] AAN, Zespół 13, Ministerstwo Rolnictwa i Reform Rolnych, 1918-1939, sygn. 5857, k. 61. Odstąpienie państwowych gruntów na cele reformy rolnej.

[47] Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна (далей: ЗДАМ), ф. 439, воп. 1, спр. 3818, арк. 2. Дело о выделении на хутора крестьян деревни Калиновка Мядельской гмины Поставского повета.

дарчыя будынкі[48]. За сезон два кваліфікаваныя інжынеры-землямеры з дапаможным персаналам маглі ажыццявіць памер 1 000 га на абшары дзвюх і больш гмін, у той час як для высвятлення ўсіх маёмасных абставін справы патрабавалася б дзейнасць некалькіх юрыстаў[49]. Вялікай праблемай на шляху камасацыі стала таксама непісьменнасць многіх мясцовых сялян, з-за чаго ўладам часта было цяжка дакладна вызначыць усе абставіны землеўладання і землекарыстання.

Неабходна падкрэсліць, што польскія ўлады надавалі вялікую ўвагу правядзенню камасацыі ў Заходняй Беларусі і пільна кантралявалі працу землямераў на ўсіх этапах ажыццяўлення работ. У выпадку зацягвання тэрмінаў складання планаў камасаваных зямель землямеру пагражаў штраф у 10% за кожны месяц затрымкі ад аплаты за вызначаны аб’ём работы: напрыклад, 24 ліпеня 1929 г. землямер Адам Здраеўскі тлумачыў ВАУЗ некаторую затрымку са складаннем праекта ссялення вёсак Дамаўшчына і Пагост гміны Нова-Пагост Браслаўскага павета вялікім аб’ёмам работ і выклікам свайго памочніка на вайсковыя вучэнні. 17 ліпеня 1931 г. землямер абгрунтоўваў чарговую затрымку сваёй цяжкаю хваробай[50].

Для паспяховага ажыццяўлення камасацыі неабходна было дадатковае надзяленне сялян ворнаю зямлёю, так, напрыклад, тагачасныя даследчыкі рабілі выснову, што „аб’яднанне надзелаў без надзялення зямлёю карлікавых гаспадарак (да 5 га) становіцца прычынаю яшчэ далейшай іх галечы і страты вытворчых сіл”[51], таму па магчымасці пры камасацыі ўладальнікі навакольных карлікавых гаспадарак (да іх адносіліся тыя гаспадаркі, якія не маглі забяспечыць сям’ю з 5 чалавек) паводле цыркуляра МСГР ад 17 лютага 1926 г. надзяляліся польскімі ўладамі дадатковаю зямлёю на платнай аснове да вызначанай нормы: I эканамічная акруга — 4,0 га; II — 4,5; III — 5,0; IV — 6,0; V — 7,0[52] (для Заходняй Беларусі, IV эканамічная акруга, у асноўным 5,5 га III класа ў эквіваленце, кошт 1 га зямлі III класа звычайна вызначаўся як адпаведнік кошту 20 цэнтнераў жыта). Так, 23 мая 1929 г. у сувязі са

48 K. Kasiński, *Działalność Ministerstwa Reform Rolnych i Urzędów Ziemskich w okresie od roku 1918 do 1 I 1928 roku*, Warszawa 1928, s. 39; S. Odlanicki-Poczobutt, *Województwo nowogródzkie*, s. 449.

49 W. Mich, *W obliczu wywłaszczenia...*, s. 127.

50 ЗДАМ, ф. 439, воп. 1, спр. 5645, арк. 43, 105. Документы (договоры, списки крестьян и землемеров, рапорты и др.) о выделении на хутора крестьян (Виленского) округа и об оплате за проведение землеустроительных работ.

51 C. Madajczyk, *Burżuazyjno-obszarnicza reforma rolna w Polsce...*, s. 275.

52 В. Л. Галуха, *Соціально-економічні наслідки структурних змін у аграрній сфері Волині міжвоєнного періоду*, [у:] А*ктуальні проблеми вітчизняної та всесвітньої історії. Наукові записки Рівненського державного гуманітарного університету: збірник наукових праць*, Рівне 2008, вип. 13, с. 106.

ссяленнем вёсак Козырава, Штуканы і Паўлішкі гміны Празарокі Дзісненскага павета на надзяленне зямлёю ўладальнікаў карлікавых гаспадарак уладамі перададзены гай „Крывы ручай" абшарам 24 га[53].

Пры ажыццяўленні камасацыі сялянскія землі ацэньваліся ў адпаведнасці з ураджайнасцю зямлі, а сяляне па магчымасці набывалі яе ў наваколлі. Напрыклад, 13 жніўня 1929 г. зямля сялян вёскі Хацілкі гміны Свір Свянцянскага павета па паказчыках ураджайнасці ацэначнаю камісіяй падзелена на сем класаў, у адпаведнасці з чым вызначаўся і яе рынкавы кошт: глеба I класа — грунты гліністыя з урадлівым слоем каля 20 сантыметраў, пад якім пясок, даючыя добры ўраджай збожжавых; II — гліністая, пад ёю пясок, грунты сельскагаспадарча добрыя, часткова залічаныя да I класа; III — глебы разнастайныя, у асноўным пясчаныя і гліністыя, з даволі добраю ўраджайнасцю; IV — глебы камяністыя; V — глебы камяністыя ці з дамешкам вапны; VI — камяністыя, глыбоказярністыя, ці пяскі наджвіравыя, цяжкія да сельскагаспадарчай апрацоўкі; VII — не падыходзячыя да сельскагаспадарчай апрацоўкі. Глеба I класа каштавала 100 злотых, II — 80, III — 60, IV — 40, V — 20, VI — 10, VII — 5 злотых за 1 га.

27 студзеня 1930 г. сяляне вёскі Хацілкі купілі за 500 злотых у маёнтку Болькаўшчына (Болькаў) памешчыка Юзэфа Бліжэўскага надзел зямлі памерам каля 0,9 га. 7 лютага 1930 г. землямерам Людвікам Пазняком складзены агульны план вёскі Хацілкі плошчаю 518,8 га і вартасцю 27 610,05 злотага. Дамінуючае месца ў сялянскім землекарыстанні займалі грунты III класа[54].

Пры выдачы крэдытаў польскімі ўладамі ўлічвалася матэрыяльнае становішча мясцовага сялянства і сярэдні рынкавы кошт зямлі ў азначаных ваколіцах. Так, напрыклад, 17 студзеня 1930 г. сялянам вёскі Жардзелі гміны Камаі Свянцянскага павета Патапу Коласаву (меў 19,5 га вартасцю 9 750 злотых, 2 коней, 3 каровы, 1 свінню, 2 авечкі, уласны дом) выдадзена на перанясенне будынкаў 800 злотых і на меліярацыю 200 злотых з выплатаю на працягу 15 гадоў; Давіду Коласаву (меў 23,5 га на 11 626 злотых, 2 коней, 3 каровы, 1 свінню, 6 авечак, уласны дом) — 800 і 200 злотых; Броніславу Ільяшэвічу (меў 19,6 га на 9 809 злотых, 3 коней, 4 каровы, 5 авечак, уласны дом, гумно, абору, лазню і пуню) выдадзена 500 і 200 злотых. Паводле ацэнкі ацэначнай камісіі ад 25 лістапада 1928 г. сярэдні рынкавы кошт 1 га мясцовай ворнай зямлі складаў 500 злотых[55].

53 AAN, Zespół 13, Ministerstwo Rolnictwa i Reform Rolnych, 1918-1939, sygn. 5859, k. 5a. Odstąpienie państwowych gruntów na cele reformy rolnej.

54 ЗДАМ, ф. 306, воп. 1, спр. 21, арк. 48, 60-61, 229. Дело о разбивке на хутора земель дер. Хотилки.

55 ЗДАМ, ф. 306, воп. 1, спр. 15, арк. 1, 5, 7. Дело о выдаче ссуд крестьянам дер. Жардели Комайской гмины в связи с проведением земельной реформы.

Варта падкрэсліць, што правядзенне такіх карэнных пераўтварэнняў, як камасацыя, не магло не выклікаць канфліктаў і непаразуменняў паміж уладамі і сялянствам і нават паміж самімі заходнебеларускімі сялянамі. Так, 22 кастрычніка 1925 г. Віленскі акруговы суд разгледзеў справу сялян вёскі Валейкавічы гміны Сольск Ашмянскага павета ў справе недапушчэння землямера Аляксандра Палешчука да працы на полі, гвалту ў адносінах да яго, уладальніка навакольнага маёнтка Шафнагеля і прысутных паліцыянтаў, прычым у аднаго з іх падсудныя адабралі вінтоўку, і прысудзіў Ю. Бравінскага да 2 гадоў, Ю. Лаздоўскага і І. Чэбатулю да 1 года, а іншых сялян да 5 і 6 месяцаў турэмнага зняволення[56].

17 верасня 1926 г. сялянка вёскі Тамашоўка гміны Крэва Ашмянскага павета Алімпія Дземідовіч (у дзявоцтве Стафаноўская) звярталася да павятовага зямельнага камісара з просьбаю аб выдзяленні належачага ёй пасля смерці бацькі надзела зямлі ў 4 дзесяціны. На азначаных землях гаспадарыў брат Алімпіі, Канстанцін Стафаноўскі, з якім у прысутнасці сведкаў яна заключыла вусную дамову: калі пры выхадзе замуж сястры будзе дадзены пасаг, то зямля застаецца Канстанціну, а калі не, то частку зямлі яна забярэ сабе. Дземідовіч скардзілася, што жыхары вёскі Паклева пагадзіліся на правядзенне ў іх мясцовасці камасацыі і падпісалі дамову, аб чым яе не папярэдзілі, і таму прасіла павятовага зямельнага камісара аб выдзяленні належачай ёй зямлі, бо абяцанага пасагу яна не дачакалася і ў яе стварылася ўражанне, што брат збіраецца прысвоіць яе зямлю. Пасля працяглага разгляду пратэння ўлады пастанавілі 19 снежня 1929 г. выдзеліць Алімпіі належачы ёй зямельны надзел[57].

12 чэрвеня 1928 г. на сходзе сялян вёскі Лабы гміны Ракаў Маладзечанскага павета ў прысутнасці павятовага зямельнага камісара Лявона Бутлера высветлілася, што галоўнымі аргументамі супраць камасацыі былі недахоп вады, нежаданне пераносіць хату і гаспадарчыя будынкі, а таксама тое, што некаторыя гаспадары былі занадта старымі для перасялення. У адказ на гэта ўлады адзначылі, што выказаныя аргументы не заслугоўваюць увагі, бо пры пацвярджэнні недахопу вады будзе праведзена меліярацыйная экспертыза, перанясенне будынкаў ажыццяўляецца толькі са згоды ўладальніка, старасць уладальнікаў гаспадаркі не з'яўляецца сутнасным матывам пры ажыццяўленні камасацыі[58].

[56] *Борьба трудящихся Западной Белоруссии...*, т. 1, с. 325-326.

[57] ЗДАМ, ф. 265, воп. 1, спр. 51, арк. 27, 28, 128. Дело о разбивке на хутора дер. Паклево, Гольшанской гмины.

[58] ЗДАМ, ф. 439, воп. 1, спр. 3808, арк. 4. Дело о выделении на хутора крестьян деревни Лабы Раковской гмины Молодечненского повета.

Варта адзначыць, што пад час камасацыі некаторыя члены мясцовых рад ссялення, карыстаючыся службовым становішчам, незаконна займалі лепшыя землі, з-за чаго ўзнікалі канфлікты. Так, 16 красавіка 1931 г. Ашмянская павятовая зямельная ўправа атрымала ананімны ліст з паведамленнем, што селянін вёскі Каменка гміны Гальшаны Ян Захаранка валодае зямлёю ў памерах 9,5 дзесяціны і надзелам луга незаконна, бо на самой справе гэтая зямля належыць яго брату Вінцэнту, які даўно выехаў у ЗША і не даваў пра сабе больш знаць. Аўтар ліста паведамляў, што Ян Захаранка з'яўляецца крэўным родзічам войта гміны Гальшаны і таму крадзе лес, забірае на свой надзел увесь гной суседзяў, і нават іх пабудовы прысвоіў сабе. Ананімка была перанакіравана ў павятовае староства для азнаямлення і магчымага выкарыстання[59]. Далейшы лёс ліста невядомы, але на працягу ўсяго перыяду камасацыі вёскі Ян Захаранка з'яўляўся членам мясцовай рады ссялення, таму хутчэй за ўсё выкладзеныя ў лісце факты не пацвердзіліся і зямля засталася за селянінам.

Вынікі і значэнне камасацыі

Скамасаваныя гаспадаркі станавіліся заможнейшымі і аказваліся лепш падрыхтаванымі да негатыўных наступстваў сусветнага эканамічнага крызісу 1929-1933 гадоў[60]. Як адзначылі тагачасныя польскія даследчыкі, у гэты час камасацыя выйшла на першае месца ў рамках складовых частак аграрнай палітыкі польскіх улад, стала яе „вокам у галаве" („oczkiem w głowie")[61]. Акрамя таго, мясцовы перыядычны друк у 1929-1930 гг. заклікаў урад у сувязі з вышэйадзначанымі прычынамі прыспешыць правядзенне камасацыі і адначасова прапаноўваў знізіць плату за ажыццяўленне ссялення 1 га да 18 злотых[62]. „Tygodnik Rolniczy" („Сельскагаспадарчы штотыднёвік") у нумары ад 1 снежня 1934 г. пісаў, што на працягу толькі 1933 г. у Віленскім і Навагрудскім ваяводствах, дзе асабліва высокімі тэмпамі праводзілася камасацыя, скамасавана 13 500 гаспадарак плошчай 100 000 га[63].

59 ЗДАМ, ф. 265, воп. 1, спр. 45, арк. 50. Дело о разбивке на хутора земель околиц Камёнки Гольшанской гмины.

60 E. Mejer, *Gospodarstwa powstałe w wyniku przebudowu ustroju rolnego w województwach wileńskim, nowogródzkim i poleskim w świetle cyfr z roku 1930/31*, Wilno 1936, s. 32-33.

61 AAN, Zespół 323, Akta Kazimierza Lewińskiego, sygn. 12, k. 31. Działalność BBWR w zakresie prac gospodarczo-społecznych na terenie województwa poleskiego. Sprawozdania ze zjazdów, okólnik, komunikaty polityczno-gospodarcze, 1933-1935; *Historia chłopów polskich*, t. 3: *Okres II Rzeczypospolitej i okupacji hitlerowskiej*, s. 140.

62 НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 297, арк. 5. Материалы о работе в деревне.

63 НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 398, арк. 186. Материалы о революционном движении крестьян в Западной Белоруссии и отчёты комиссии по изучению Западной Белоруссии.

З мэтай прапаганды камасацыі ўякасці ўзоравых у розных рэгіёнах дзяржавы ствараліся спецыяльныя, забяспечаныя водапровадам, электрычнасцю і каналізацыяй вёскі (так званыя „панятоўкі", названыя ў „гонар" тагачаснага міністра сельскай гаспадаркі Юльюша Панятоўскага), землі якіх былі асушаны і скамасаваны пад пільным наглядам улад[64]. Разам з тым, у цэлым прапаганда камасацыі з боку ўлад стала ўжо празмернай, бо калі ў наваколлі была скамасавана хоць бы адна вёска, то мясцовыя сяляне бачылі перавагі гэтага і масава падавалі заявы з просьбаю аб аб'яднанні зямель, а павятовыя зямельныя ўправы нават не паспявалі своечасова выконваць усе сялянскія просьбы аб камасацыі.

З ініцыятывай падачы заяў аб ажыццяўленні камасацыі звычайна выступалі ўладальнікі гаспадарак агульным абшарам больш 5 га, пераважна энергічныя і няблага адукаваныя. Для такіх сялян асобная гаспадарка, аддзеленая ад уплыву суседзяў, станавілася сродкам паляпшэння дабрабыту і месцам для рэалізацыі ўласных гаспадарчых ініцыятыў. У створаных умовах самастойнасць гаспадара ў арганізацыі новых метадаў працы і па ўкараненні ў гаспадарцы перадавых спосабаў апрацоўкі зямлі, а нават змены сістэмы гаспадарання, пры наяўнасці дастатковых сродкаў нічым не абмежавана. Разам з тым недахоп агульных ведаў і спецыяльнай падрыхтоўкі не заўсёды дазваляў карэнную прагрэсіўную перабудову асабістай гаспадаркі, і таму селянін звычайна захоўваў традыцыйныя метады гаспадарання — галоўным чынам трохполле. Узоравымі станавіліся тыя сялянскія гаспадаркі, у якіх пад кіраўніцтвам спецыяльна падрыхтаванага агранамічнага персаналу былі распрацаваны і ўкаранены тагачасныя перадавыя метады гаспадарання, перш за ўсё чаргаванне сельскагаспадарчых культур і арганізацыя штучнай пашы. Уласнікі ўзоравых гаспадарак шукалі новыя шляхі ў апрацоўцы зямлі з мэтай павышэння яе ўраджайнасці, служылі прыкладам для навакольных сялян у пошуку новых метадаў і спосабаў павышэння ўрадлівасці зямлі[65]. Як пісаў у 1932 г. польскі інжынер Крыстын Астроўскі (Krystyn Ostrowski): „Камасацыя — сродак выпраўлення аграрнага ладу Польшчы, без якога нельга нават і думаць аб павышэнні ўраджайнасці і агульнай культуры апрацоўкі зямлі. Без яе [камасацыі] селянін не зможа стаць сапраўдным грамадзянінам дзяржавы, не будзе адукацыі і дабрабыту"[66]. Астроўскі абгрунтоўваў вялікую адказнасць дзяржавы

64 W. Morawski, *Dzieje gospodarcze Polski*, Warszawa 2010, s. 216.
65 S. Odlanicki-Poczobutt, *Województwo nowogródzkie*, s. 451.
66 K. Ostrowski, *Teorja i praktyka naszej komasacji*, „Rolnictwo", 1932, kwiecień, s. 15-17.

пры ажыццяўленні камасацыі і недапушчальнасці памылак, бо ўжо раз скамасаваныя гаспадаркі будзе немагчыма скамасаваць ізноў. Пры камасацыі суседніх вёсак лепш было б, каб іх цэнтр знаходзіўся на памежжы, а не паасобку, прапаноўвалася таксама веерападобнае размяшчэнне зямельных надзелаў, што, на думку інжынера, спрыяла б поспеху камасацыі і перашкаджала далейшаму драбненню сялянскіх гаспадарак.

У цэлым сярод заходнебеларускіх ваяводстваў найбольш спрыяльныя ўмовы для камасацыі склаліся менавіта ў Віленскім ваяводстве, дзе ўзровень цераспалосіцы быў не такім высокім, а насельніцтва больш заможным. Усяго за 1921-1939 гг. у Віленскім ваяводстве, паводле дадзеных дзяржаўнай статыстыкі, скамасавана 2 544 вёскі з 75 215 гаспадаркамі, якім належала 615 506,4 га[67], сведчаннем чаму з'яўляецца наступная табліца:

Табліца 3. Ажыццяўленне камасацыі ў Віленскім ваяводстве (1921-1939 гг.)

Перыяд	Колькасць гаспадарак	Плошча, у га
1921 – сяр. 1929	15 454	173 127
1929-1933	19 897	180 369
1934-1939	39 864	262 010,4
Разам	**75 215**	**615 506,4**

У выніку камасацыі за кошт скарачэння колькасці межавых палосак агульная плошча надзелаў узрастала ад 3% да 9%, дзякуючы ўдасканаленню і ўдакладненню існуючых у аграрнай сферы юрыдычных адносін, кошт скамасаванай зямлі ўзрастаў прыкладна на 30%[68], істотна памяншалася колькасць неабходных для апрацоўкі надзелу працадзён, паляпшалася якасць апрацоўкі і ўзрастала ўраджайнасць ворнай зямлі. Варта звярнуць увагу, што некаторыя сяляне, ведаючы, што іх землі пяройдуць да іншага ўладальніка, свядома ўдзялялі ім менш увагі і запускалі іх, што часта стварала новым гаспадарам вялікія цяжкасці[69].

Падводзячы вынікі, трэба падкрэсліць, што правядзенне польскімі ўладамі ў Віленскім ваяводстве ў 1921-1939 гг. камасацыі мела на мэце ліквідацыю цераспалосіцы, вылілася ў паўсюднае насаджэнне эканамічна самастойных рынкава арыентаваных гаспадарак фермерскага тыпу, садзейнічала станаўленню капіталістычных адносін у аграрнай

[67] *Mały rocznik statystyczny*, Warszawa 1939, s. 70.
[68] *Rolnictwo w Polsce. Jaki jest stan rolnictwa i co rząd robi dla jego podniesienia*, Warszawa 1930, s. 11-12.
[69] B. Dederko, *Organizacja gospodarstw i wsi świeżo scalonych*, Warszawa 1931, s. 1.

сферы рэгіёна. На аб'яднаных надзелах сялянам было прасцей выкарыстоўваць перадавыя метады апрацоўкі зямлі, сельскагаспадарчыя машыны і севаабарот, таму камасацыя паскарала эканамічную дыферэнцыяцыю мясцовага сялянства. Разам з тым неабходна адзначыць, што камасацыя стварала сялянам вялікія магчымасці для вядзення рацыянальнай асабістай сялянскай гаспадаркі, але далёка не ўсе з іх змаглі прыстасавацца да новых умоў гаспадарання, у першую чаргу з-за недахопу сродкаў і агульных ведаў.

Summary

Land consolidation in Wilno in 1921-39

The article discusses the process of land consolidation which was carried out in the Wilno Voivodeship in 1921-39. The author of the article points out that the local peasants experienced poverty due to scattered land parcels and lack of land. This was the reason why the Polish government implemented an agricultural reform, one of whose most important elements was land consolidation. The farmers who had to move home were given low-interest government loans. The land consolidation that was carried out in the Wilno Voivodeship led to the improvement of the quality and efficiency of farming.

Streszczenie

Komasacja w województwie wileńskim w latach 1921-1939

Artykuł traktuje o przeprowadzeniu komasacji w województwie wileńskim w latach 1921-1939. Autor artykułu podkreśla, że w omawianym okresie miejscowi chłopi cierpieli biedę z powodu szachownicy i głodu ziemi, dlatego polskie władze przeprowadziły reformę rolną, której jednym z najważniejszych elementów była komasacja. Rolnikom na przesiedlenie się udzielano rządowych kredytów na ulgowych warunkach. Dzięki przeprowadzonej w województwie wileńskim komasacji zmniejszyła się czasochłonność pracy na roli, polepszyła się jakość uprawy gruntów i odpowiednio wzrosła urodzajność. Słowa kluczowe: komasacja, szachownica, kolonia, polityka rolna, reforma rolna, mierniczy, urodzajność, melioracja, serwitut, parcelacja, wieś, uprawa ziemi.

Wital Harmatny — starszy wykładowca w Katedrze Nauk Społeczno-Humanistycznych Baranowickiego Uniwersytetu Państwowego (obwód brzeski, Republika Białoruś), aspirant Wydziału Historycznego Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego w Mińsku (dysertacja „Komasacja gruntów na Białorusi Zachodniej w latach 1921-1939" napisana pod kierunkiem prof. Piotra Zielińskiego). Bada politykę rolną władz polskich na Białorusi Zachodniej w latach 1921-1939. Autor ponad 70 prac naukowych opublikowanych w Białorusi, Polsce, Ukrainie i Litwie.

Ігар Пушкін
(Магілёў)

Самавызначэнне беларусаў у Магілёве падчас Першай сусветнай вайны

Першая сусветная вайна паскорыла дзяржаваўтваральныя працэсы ў Еўропе. На абшарах былой Расійскай імперыі ўзніклі такія дзяржавы, як Польшча, Фінляндыя, Літва, Эстонія, Латвія і іншыя. Актывізаваўся палітычны рух па стварэнні ўкраінскай і беларускай дзяржаў.

У беларускай і замежнай гістарыяграфіі недастаткова разгледжаны працэсы нацыянальнага і дзяржаўнага вызначэння ва ўсходняй частцы Беларусі, асабліва ў Магілёве, які быў трэцім горадам у Расіі (пасля Петраграда і Масквы), у якім вырашаўся лёс імперыі. Варта адзначыць публікацыі Юрыя Васілеўскага, Генрыха Іофе, Уладзіміра Ляхоўскага, Ігара Пушкіна і Аляксандра Агеева, Станіслава Рудовіча, Іераніма Філіповіча, якія пэўным чынам закранаюць дадзеную праблематыку[1].

Даследаванні, якія праводзіліся ў апошні год на падставе аналізу новых фактаў, адшуканых у архівах Беларусі і Літвы, дазволілі ўдакладніць шэраг спрэчных момантаў, па-новаму зразумець вытокі дзеяння і ролю ўсходнебеларускай эліты ў справе нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва і нацыянальнай ідэнтыфікацыі, тактыку дзейнасці беларускіх нацыянальных арганізацый, ліквідаваць недакладнасці, якія раней трывала ўвайшлі ў беларускую гістарыяграфію. Праведзенае даследаванне абвяргае стэрэатыпы, што пануюць у адносінах да ролі ўсходнебеларускіх гарадоў у нацыятворчых працэсах XX ст. У прыватнасці, наступны: „Беларускі ўсход даўно гіпнатызаваў нас сваёй часам гратэскавай сур'ёзнасцю й касьмічнай місійнасцю. Так ужо сталася, што формы палітычнай і нацыянальна-культурнай актыўнасці там ніколі не былі надта разьвітыя, затое не бракавала неў-

[1] Ю. Васілеўскі, *Кахановіч Міхаіл Сілуянавіч*, [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.*, т. 4, Мінск 1997, с. 153; Г. З. Иоффе, *„Белое дело”. Генерал Корнилов*, Москва 1989; У. Ляхоўскі, *Магілёўскі Беларускі Камітэт*, [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.*, т. 5, Мінск 1999, с. 24; С. Рудовіч, *Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе*, Мінск 2001; той жа, *У пошуках нацыянальнай ідэнтычнасці: Беларуская патрыятычная арганізацыя ў Магілёве ў 1917-1918 гг.*, [у:] *Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зборнік навуковых прац*, Магілёў 2001, с. 203-209; І. Пушкін, А. Агееў, *Стварэнне і дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта*, [у:] *Гарадзенскі соцыум 2013. Гісторыя і памяць. XV-XX стст.*, Гродна 2014, с. 212-229; И. Филиппович, *Могилев. Хроника событий 1917-1918 (по архивным и печатным материалам)*, Могилев 1995.

структураванай стыхійнай энэргіі. Ёсьць у ёй пэўная прывабнасьць, — не ў эфектыўнасьці, але эфектнасьці”[2].

Перыяд знаходжання ў Магілёве Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандавання падчас Першай сусветнай вайны (8(21).08.1915—25.02.1918 гг.) — адзін з самых напружаных і разам з тым цікавых. Горад фактычна з’яўляўся ваеннай сталіцай Расійскай імперыі.

У гэты час імкліва адбываліся і мяняліся падзеі. Сярод іх варта вылучыць некалькі: утварэнне першых саветаў, карнілаўшчына, кастрычніцкі пераварот у Петраградзе, спробы аднаўлення манархіі — „быў пакліканы на царства” нейкі Мітрафан „грозны” — і стварэння ў Магілёве прадстаўнікамі розных палітычных партый агульнарасійскага ўрада на чале з Віктарам Чарновым (лістапад 1917 г.), падзеі ў Стаўцы Вярхоўнага галоўнакамандавання і яе ліквідацыя, набліжэнне да горада атрадаў бальшавікоў і ўстанаўленне ў горадзе іх улады, пагроза захопу горада, уцёкі бальшавікоў, спачатку акупацыя Магілёва войскам Юзафа Доўбар-Мусніцкага, а затым германскім, аднаўленне савецкай улады.

Да грамадскага жыцця абудзілася вялікая колькасць людзей. У горадзе і губерні праводзіліся мітынгі і сходы, утвараліся грамадскія арганізацыі і мясцовыя філіі палітычных партый, выходзілі газеты „Могилевский вестник”, „Труд”, „Жизнь”, „Эхо” і іншыя. У ліку іншага ў насельніцтва адбываўся працэс нацыянальнай ідэнтыфікацыі і самавызначэння.

Вось у такіх умовах вясной 1917 г. у Магілёве была ўтворана беларуская нацыянальная арганізацыя. Пачатак быў пакладзены сходам „асобаў, што прызнаюць сябе беларусамі”, які адбыўся на кватэры адваката І. Рэўта 23 сакавіка 1917 г. На ім быў створаны Магілёўскі беларускі гурток. Спачатку ён налічваў усяго 12 асоб, пад № 1 — ксёндз Данат Лапошка[3].

Вось што аб гэтай падзеі паведаміў „Вестникъ Могилевского земства” (у перакладзе на беларускую мову): „Сход гуртка магілёўскіх беларусаў. Па ініцыятыве асоб, якія пялегавалі думку аб адраджэнні да самастойнага жыцця беларускага народа, склаўся гурток з асоб, якія прызнаюць сябе беларусамі і жадаюць гэтага. У кватэры прысяжнага паверанага Рэўта адбыўся сход нешматлікі, але цесна злучаны аднадумствам і агульным жаданнем адрадзіць Беларусь у самастойным вольным жыцці. Мэта — стварыць у Магілёве саюз беларусаў, які выпрацуе правілы будучага ладу Беларусі і яе адносіны да Расіі, Польшчы, Літвы. Але перад тым, як утварыць саюз беларусаў, вырашылі даве-

[2] Ю. Васілеўскі, А. Сёмуха. *Літаратурны акалот: Антон Беларусаў-Скалка*, „Запісы БІНіМ”, 1999, № 23, с. 159.

[3] Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (далей: БДАМЛіМ), ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 14. Спіс Магілёўскага Беларускага гуртка.

дацца, у чым будуць заключацца дзеянні і пастановы з'езда беларускіх дзеячаў, які мае адбыцца ў г. Мінску. Аднагалосна вырашылі прыняць гуртку ўдзел у гэтым з'ездзе ў асобах выбраных прадстаўнікоў: настаўніка рэальнага вучылішча М. С. Кахановіча ад праваслаўных беларусаў і настаяцеля Магілёўскага касцёла Лапошкі ад беларусаў-католікаў. Іх забяспечылі неабходнымі паўнамоцтвамі гуртка"[4].

Варта адзначыць, што ў пратаколе сходу, які захоўваецца ў фондах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва ў Мінску пазначана „для прысутнасці ў г. Мінску на з'ездзе беларускіх партый і арганізацый у якасці дэлегатаў выбраны гр. Міхаіл Сілуянавіч Кахановіч і кс. Данат Лапошка". Няма ніводнага слова аб тым, што ад праваслаўных ці католікаў[5].

Публікацыя ў газеце засведчыла імкненне беларусаў у Магілёве да нацыянальнага адзінства і пераадолення канфесійнай раз'яднанасці народа.

У памяшканні Магілёўскага павятовага з'езда 31 сакавіка 1917 г. адбыўся сход магілёўцаў, якія ўваходзілі ў склад беларускага гуртка або падзялялі яго мэты, дзе быў выбраны арганізацыйны камітэт па стварэнні ў Магілёве Нацыянальнага губернскага Беларускага камітэта. У лісце да магілёўскага губернскага камісара па справе рэгістрацыі камітэта прыведзена іншая назва — Магілёўскі Беларускі Арганізацыйны Камітэт (МБАК)[6]. 4 красавіка 1917 г. было выбрана кіраўніцтва[7].

У МБАК увайшлі 24 асобы, ва ўправу 12: прысяжны паверены І. Рэўт (старшыня), в.а. дырэктара народных вучылішчаў, беларускі гісторык і археограф Дзмітры Даўгяла (намеснік старшыні), студэнт М. Кажамяка (сакратар), члены акруговага суда І. Раманкевіч (скарбнік), В. Какашынскі, В. Кміта, інспектар вышэйшых пачатковых вучылішчаў, этнограф і фалькларыст Ісак Сербаў, ксёндз Д. Лапошка, выкладчыкі сярэдніх навучальных устаноў М. Кахановіч, А. Прэферансаў, Я. Аляхновіч і М. Пахомаў (пасля яго ад'езду з Магілёва ў склад МБАК увайшла А. Плябанская). М. Судзілоўскі, А. Семяненка, А. Раждзественскі, А. Гарбачык, У. Бачкоўскі, Ф. Ляхтановіч, Анатоль і Алёна Малевічы сталі членамі-супрацоўнікамі МБАК[8]. Былі створаны наступныя секцыі: палітычная — 11 чалавек; этнаграфічная — 4;

[4] *Собрание кружка Могилевских белоруссов*, „Вестникъ Могилевского земства", 1917, № 4, с. 35.

[5] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 14. Спіс Магілёўскага Беларускага гуртка.

[6] Там жа, спр. 137, арк. 20-20 адв. Ліст Магілёўскага аргкамітэта губернскаму камісару ад 15.04.1917 г.

[7] Там жа, спр. 136, арк. 16-19. Пратаколы пасяджэння.

[8] Там жа, арк. 10-11. Склад секцый; У. Ляхоўскі, *Магілёўскі Беларускі Камітэт...*, с. 24; С. Рудовіч, *У пошуках нацыянальнай ідэнтычнасці: Беларуская патрыятычная арганізацыя ў Магілёве...*, с. 203-204.

школьная — 8; культурна-асветніцкая — 11; арганізацыйная — 9; фінансавая — 4[9].

На чарговым сходзе, 7 красавіка 1917 г., быў разгледжаны праект статута МБАК[10], які быў канчаткова зацверджаны 18 красавіка 1917 года[11]. Аднак за тры дні да гэтага, 15 красавіка 1917 г., на імя магілёўскага губернскага камісара была пададзена заява з просьбай зарэгістраваць арганізацыю[12]. 24 красавіка 1917 г. з Магілёўскага губернскага па справах аб арганізацыях прысутствія атрыманы адказ (пасведчанне) аб рэгістрацыі Магілёўскага Беларускага Арганізацыйнага Камітэта пад № 247[13].

Найбольш актыўным членам арганізацыі быў выкладчык рэальнага вучылішча, рэдактар-выдавец штодзённай грамадска-палітычнай і літаратурнай газеты „Могилевский вестник" Міхаіл Кахановіч (1882-1934). Пасля заканчэння ў 1910 г. Харкаўскага ўніверсітэта ён вярнуўся на Радзіму — Беларусь і пэўны час выкладаў у навучальных установах Вільні: Віленскай гандлёвай школе, прыватнай гімназіі „Katche", прыватнай мужчынскай гімназіі Таварыства распаўсюджвання сярэдняй адукацыі[14]. У сувязі з падзеямі на франтах Першай сусветнай вайны летам 1915 г. быў вымушаны пераехаць у Магілёў. Менавіта па яго ініцыятыве было праведзена арганізацыйнае пасяджэнне гуртка магілёўскіх беларусаў, які пазней пераўтварыўся ў Магілёўскі Беларускі Камітэт (МБК). М. Кахановіч быў не толькі адным з яго арганізатараў, але і стаў пазней старшынёй. У Магілёве ён пабраўся шлюбам з Кацярынай Чаркас з сям'і карэнных магілёўцаў[15]. З 1919 г. М. Кахановіч — кіраўнік школьнага аддзела Цэнтральнай беларускай рады Віленшчыны і Гродзеншчыны, прымае актыўны ўдзел у адкрыцці Віленскай беларускай гімназіі, якую з 1919 г. па 1922 г. узначальваў. З 1922 г. — дэпутат сейма Польшчы. У 1925 г. пераязджае ў савецкую Беларусь, у 1933 г. быў арыштаваны органамі ДПУ БССР, асуджаны і 17 мая1934 г. расстраляны. Рэабілітаваны 16 жніўня 1956 г.

9 БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 10-11, 25-26 адв. Склад секцый. Пратакол сходу МБАК ад 19.05.1917 г.; Lietuvos valstybės centrinis archyvas (далей: LVCA), f. 582, ap. 1, b. 1, lap. 29. Месцы беларускай працы.

10 БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 20. Пратакол сходу МБАК ад 7.04.1917 г.

11 Там жа, арк. 21. Пратакол сходу МБАК ад 18.04.1917 г.

12 Там жа, спр. 137, арк. 20-20 адв. Заява ад МБАК ад 15.04.1917 г.

13 БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 137, арк. 57. Ліст у МБАК ад 24.04.1917 г.

14 А. Горны, *Міхаіл Кахановіч: лёс інтэлігента*, „Краязнаўчая газета", 2013, № 14, крас., с. 4.

15 У Магілёве жыла дачка Міхаіла Сілуянавіча Кахановіча — Зоя Міхайлаўна, якая захавала прозвішча бацькі і памерла ў 2002 г. крыху не дажыўшы да свайго 83-годдзя. Дарэчы, яна сябравала яшчэ з Вільні з дачкою С. Рак-Міхайлоўскага, якая перад Другой сусветнай вайной таксама жыла ў Магілёве. Жыў у горадзе

Пратаколы першых пасяджэнняў дазваляюць нам вызначыць кола інтарэсаў і асноўныя кірункі дзейнасці МБК. Так, напрыклад, 30 красавіка 1917 г. на агульным сходзе беларускай грамадскасці Магілёва пасля прывітальнага слова старшыні МБК І. Рэўта прагучалі даклады: М. Кажамякі „Развитие Белорусского края”, Дз. Даўгялы „Историческое развитие Белорусского народа”, І. Сербава „Границы Белорусского края и народы, населяющие Белоруссию”, Я. Аляхновіча „Ближайшие задачи Могилевского Белорусского комитета и организация Белоруссии”, А. Пігулеўскага „О текущем моменте в связи с организацией Белоруссии”, М. Кахановіча „Белорусский съезд в Минске”. Напрыканцы членамі МБК былі выбраны яшчэ 12 асоб[16]. Па назвах дакладаў можна зрабіць выснову, што тагачаснае грамадства найбольш хвалявала пытанне ўтварэння Беларусі („организации Белоруссии”).

Архіўныя дакументы раскрываюць эвалюцыю назваў арганізацыі беларусаў горада Магілёва. Ад 23 сакавіка 1917 г. — Магілёўскі Беларускі гурток, з 31 сакавіка 1917 г. — Магілёўскі Беларускі Арганізацыйны Камітэт, з чэрвеня па снежань 1917 г. — Магілёўскі Беларускі Камітэт, са снежня 1917 г. — Магілёўская Беларуская Рада (МБР). Апошняя назва ў дакументах сустракаецца з кастрычніка 1917 года, у тым ліку і на бланках МБК. Наогул, напачатку планавалася назва Нацыянальны губернскі Беларускі камітэт. Агульны сход арганізацыі ў некаторых пратаколах абазначаны як Магілёўскі Беларускі Нацыянальны сход.

Кіравалі Магілёўскім Беларускім Камітэтам: І. Рэўт (4.04.-19.05.1917), В. Какашынскі (24.05.-20.10.1917), М. Кахановіч (20.10.1917 г. — кастрычнік 1918)[17].

Спачатку МБК размяшчаўся ў будынку па Дняпроўскім праспекце, д. 12, пазней (па май 1918 г.) у памяшканні акруговага суда (будынак Марыінскай жаночай гімназіі па Дняпроўскім праспекце, сёння СШ № 1 г. Магілёва па вул. Першамайскай), у „Брацкіх радах”, з чэрвеня 1918 г. у памяшканні аддзела народнай адукацыі Павятовай земскай управы (вул. Малая Садовая, д. 21). Перыядычна пасяджэнні адбываліся на кватэры І. Рэўта (Дняпроўскі пр-т, д. 35), М. Кахановіча (Дняпроўскі пр-т, д. 83, кв. 5; Віленская, д. 23).

Колькасць прыхільнікаў Магілёўскага Беларускага Камітэта даволі хутка дасягнула некалькіх соцень чалавек. Ствараліся яго структуры

ўнук — Віктар Сямёнавіч Кахановіч. Не забываюць пра свайго продка праўнук — Дзмітрый Віктаравіч Кахановіч і яго сястра, прапраўнукі славутага беларускага дзеяча.

[16] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 24. Протокол собрания белорусского общества 30.04.1917 г.

[17] Там жа, арк. 25-26 адв. Пратакол сходу МБАК ад 19.05.1917 г.; там жа, арк. 28-29. Пратакол сходу МБАК ад 24.05.1917 г.; там жа, арк. 51. Пратакол пасяджэння МБК ад 20.10.1917 г.; У. Ляхоўскі, *Магілёўскі Беларускі Камітэт...*, с. 24.

ў некаторых установах як самастойныя адзінкі. Напрыканцы 1917 г. або ў самым пачатку 1918 г. быў арганізаваны беларускі гурток пры рэальным вучылішчы[18]. Рабіліся захады па заснаванні філій МБК у павятовых гарадах губерні (Быхаве, Мсціслаўлі, Рагачове і інш.)[19]. Былі наладжаны кантакты з беларускімі арганізацыямі ў Віцебску, Гомелі, Оршы, з Беларускай народнай грамадой у Маскве.

Прадстаўнікі МБК увайшлі ў склад і актыўна дзейнічалі ў шэрагу грамадскіх установаў горада Магілёва, павета і губерні: М. Кахановіч разам з прадстаўнікамі іншых арганізацый горада ўвайшоў у створаны пры губернскім камісары Камітэт грамадскай бяспекі, В. Кміта быў дэлегаваны для ўдзелу ў пасяджэннях Магілёўскай губернскай зямельной камісіі, М. Судзілоўскі, У. Лукін дэлегаваны ў Магілёўскае Павятовае Земскае сабранне, М. Кахановіч, В. Кміта, Д. Аляхновіч дэлегаваны ў Магілёўскі выканаўчы камітэт. 8 ліпеня 1917 г. старшыня Магілёўскай губернскай земскай управы прасіў накіраваць прадстаўніка ад беларускай арганізацыі ў арганізацыйнае бюро, якое стваралася управай, па падрыхтоўцы агульнагубернскага з’езда па народнай адукацыі (на з’езд па адукацыі былі накіраваны 4 прадстаўнікі ад МБАК), прадстаўнікі МБАК прысутнічалі на пасяджэннях Магілёўскага павятовага школьнага камітэта[20] і інш.

Беларусы Магілёва, а гэта былі пераважна прадстаўнікі інтэлігенцыі, віталі спробы нацыянальнага адраджэння. У 1917-1918 гг. па ініцыятыве або пры актыўным удзеле членаў Магілёўскага Беларускага Камітэта адбылося даволі шмат значных падзей.

24-25 чэрвеня 1917 г. у Магілёве былі праведзены Дні вольнай Беларусі, прымеркаваныя да свята Купалля. Дэманстраваліся дасягненні нацыянальнага мастацтва, чыталіся рэфераты па гісторыі Беларусі, распаўсюджваліся лістоўкі Беларускага Нацыянальнага Камітэта. Вуліцы горада былі ўпрыгожаны плакатамі і нацыянальнымі беларускімі сцягамі, актывісты ў народных строях правялі скарбонačны збор

[18] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 62 адв. Пратакол пасяджэння ВК МБР 18.01.1918 г.; Lietuvos moksli akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skurius (далей: LMAVB RS), f. 21, vnt. 2218, lap. 46 a. Статут Беларускага гуртка рэалістаў (рэальнага вучылішча).

[19] LMAVB RS, f. 21, vnt. 2071, lap. 1. Ліст МБАК ад 5.06.1917 г. у г. Быхаў; БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 137, арк. 25. Ліст МБАК ад 9.06.1917 г. у Мсціслаў; Там жа, арк. 81. Адказ дырэктара Рагачоўскай настаўніцкай семінарыі аб арганізацыі беларускага аддзела, 18.07.1917 г.

[20] Там жа, арк. 22. Ліст МБАК ад 20.05.1917 г.; там жа, арк. 26. Пастанова МБК ад 3.06.1917 г.; там жа, арк. 27. Пастанова Магілёўскага Беларускага Нацыянальнага сходу ад 6.06.1917 г.; там жа, арк. 79-79 адв. Ліст ад 8.07.1917 г.; там жа, арк. 84-84 адв. Ліст ад Магілёўскай губернскай земскай управы ў МБАК ад 24.07.1917 г.; там жа, арк. 99. Ліст у Магілёўскую Беларускую Раду ад 19.10.1917 г.

сродкаў на патрэбы беларускага руху, а ў ноч на Івана Купала на гарадскім вале адбылося гулянне[21], для якога быў запрошаны духавы аркестр Георгіеўскага батальёна[22]. У выніку агульная сума сабраных сродкаў склала 2 083 руб. (з іх: у 43 скарбонках — 1 041 руб. 98 кап., ад продажу квіткоў і ахвяраванні — 1 044 руб. 96 кап., за кветкі — 50 руб. і інш.)[23]. Святкаванні прынеслі значны прыбытак — выдаткі склалі ўсяго 444 руб. 75 кап.[24]

Прадстаўнікі МБК прымалі ўдзел ў працы Першай Сесіі Цэнтральнай Рады Беларускіх Арганізацый у Менску 5-7 жніўня 1917 г., якая праходзіла ў памяшканні „Беларуская хатка". На сесіі быў зацверджаны Статут Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый як „кіраўніка і прадстаўніка ўсёй беларускай справы". Рада пастанавіла паслаць дэлегатаў у Кіеў на нараду (з'езд) „недзяржаўных народаў", які адбыўся 8-15 верасня 1917 г. У ім бралі ўдзел прадстаўнікі грузінаў, літоўцаў, татараў, латышоў, эстонцаў, беларусаў, малдаванаў, данскіх казакаў, буратаў і яўрэяў, у іх ліку прадстаўнік МБК[25].

13 жніўня 1917 г. адбываліся выбары ў Магілёўскую гарадскую думу. Упершыню ў гісторыі горада ўсеагульныя, роўныя і прамыя пры тайным галасаванні. Яны дазволілі МБК яшчэ мацней заявіць пра сябе і праверыць свой рэйтынг сярод гараджан.

МБК грунтоўна рыхтаваўся да гэтай падзеі. Яшчэ 28 чэрвеня 1917 г. на пасяджэнні былі абмеркаваны пытанні аб выбарах у Гарадскую думу і правядзенні выбарчай кампаніі. Для распрацоўкі праграмы дзеянняў было прапанавана правесці 3 ліпеня агульны сход беларусаў г. Магілёва[26]. Вырашылі ўтварыць саюз з домаўласнікамі Магілёва з мэтай адстойвання інтарэсаў карэнных жыхароў горада. 16 ліпеня 1917 г. на пасяджэнні МБК вызначылі 5 кандыдатаў ад камітэта ў гласныя Гарадской думы[27]. Сфарміравалі спіс прагрэсіўнага

[21] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 34-35. Пратакол пасяджэння камісіі па наладжванні скарбоначнага збору і гуляння на карысць Беларускага камітэта, 12.06.1917 г.; там жа, спр. 137, арк. 63 адв. Склад камісіі па наладжванню агульнагарадскога гуляння 24-25.06.1917 г.; там жа, спр. 136, арк. 33 адв. Склад камісіі па наладжванню скарбоначнага збору і гулянняў 23-24.06.1917 г.

[22] Там жа, спр. 137, арк. 6. Исходящий журнал МБК, 1917 г.

[23] Там жа, спр. 136, арк. 44 адв. Пратакол пасяджэння МБАК ад 28.06.1917 г.

[24] Там жа, арк. 64 адв. Справаздача скарбніка ад 18.01.1918 г.

[25] *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі*, рэд. С. Шупа, Вільня — Нью-Ёрк — Менск — Прага 1998, т. 1, кн. 1, с. 13; LVCA, f. 582, ap. 1, b. 1, lap. 15-20адв. Матэрыялы першай сесіі; БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 137, арк. 85. Ліст у МБК ад выканаўчага камітэта Цэнтральнай Рады Беларускіх арганізацый ад 26.08.1917 г. за подпісам Я. Лёсіка.

[26] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 44-44 адв. Пратакол пасяджэння МБНК 28.06.1917 г.

[27] Там жа, арк. 46. Пратаколы пасяджэння МБК 16.07.1917 г.

насельніцтва ўскраін горада Магілёва і Беларускага Нацыянальнага Камітэта — кандыдатаў у гласныя Гарадской думы на выбарах і сфармулявалі „Муніцыпальную праграму Беларускага Нацыянальнага Камітэта і прагрэсіўнага насельніцтва ўскраін горада Магілёва на выбарах 13.08.1917 г.”[28]. Перадвыбарчая агітацыя членаў МБК праводзілася па нядзелях у царкоўных прыходах: Барыса-Глебскім (Даўгяла), Мікалаеўскім (Кахановіч), Саборным (Гарбацкі), Успенскім (Дзмітрыеў і Лукін), на Мышакоўцы (А. Малевіч)[29].

Добра прадуманая перадвыбарчая кампанія прынесла пэўны плён: за беларускі спіс прагаласавалі каля 2,1 тыс. гараджан, што дазволіла камітэту атрымаць 6 месцаў у думе з 64 дэпутатаў. Па выніках выбараў быў створаны Беларускі камітэт гласных Гарадской думы г. Магілёва.

Адразу да яго пацягнуліся жыхары горада і прадмесцяў. Так ад імя насельніцтва Лупалава (задняпроўскае прадмесце Магілёва) да Беларускага камітэта гласных Гарадской думы звярнуліся бацькі навучэнак Петра-Паўлаўскай школы з просьбай аб адкрыцці настаўніцкай семінарыі: „Граждане — Белоруссы! Целые столетия стояла тьма над окраиной города Луполова! Только трактиры и пивные лавочки покрывали унылою сетью наше темное Луполово. И вот теперь, когда самосознание народностей прояснилось и народы увидели в чем заключается его счастье, народ вместе с политическим самоопределением и защитой своих национальных черт, своей национальной души стал стремиться к образованию. Эта жажда образования охватила и нас Луполовцев — белоруссов, мы собрали из своих последних средств 13 тысяч рублей и просим открыть учительскую семинарию (...). 300 родителей совместно со всем населением Луполова просит Вас поддержать при голосовании открытие на Луполово учительской семинарии и тем дать счастье всему белорусскому Луполовскому населению”[30].

Напрыканцы лета — у пачатку восені 1917 г. М. Кахановіч з паплечнікамі займаўся вылучэннем кандыдатаў на выбарах дэлегатаў на

[28] LMAVB RS, f. 21, vnt. 2251, lap. 7. Зварот з праграмай і агітацыйным матэрыялам Магілёўскага беларускага камітэта да насельніцтва Магілёва з нагоды выбараў 13.08.1917 г.; там жа, vnt. 2218, lap. 22-24 адв. Список прогрессивного окраинного населения гор. Могилева и Белорусского Национального Комитета — кандыдатаў у гласныя Гарадской думы на выбарах 13.08.1917 г.; там жа, vnt. 2251, lap. 26-26 адв. Муниципальная программа Белорусского Национального Комитета и прогрессивного окраинного населения гор. Могилева.

[29] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 45 адв. Пратакол пасяджэння МБНК 15.07.1917 г.

[30] Там жа, спр. 137, арк. 103-103 адв. Ліст ад 19.10.1917 г. у Беларускі камітэт гласных Гарадской думы ад насельніцтва Лупалава і бацькоў Петра-Паўлаўскай школы.

„Устаноўчы сход” па г. Магілёве. У газеце „Могилевская жизнь” за 16-23 кастрычніка 1917 г. быў апублікаваны спіс кандыдатаў ад МБК[31]: М. С. Кахановіч, Дз. І. Даўгяла, П. А. Счансноўскі, Я. С. Аляхновіч, А. К. Ляхтановіч. Яны ўпяцёх ад Магілёўскага Беларускага Камітэта ўвайшлі ў выбарчы спіс (налічваў 15 асобаў) беларускіх арганізацый Магілёўскай губерні на выбарах ва Устаноўчы сход Расіі[32].

Гэты спіс быў складзены ў выніку перамоваў з арганізацыямі Оршы (Аршанскі беларускі народны камітэт) і Гомеля (Гомельскі саюз беларускай дэмакратыі) і зацверджаны на агульным сходзе Беларускага Нацыянальнага Саюза, які адбыўся 12 кастрычніка 1917 г. у г. Магілёве[33]. Ідэя агульнага спісу беларускіх арганізацый Магілёўскай губерні спачатку знайшла падтрымку на з’ездзе ў г. Оршы, які адбыўся 8 кастрычніка 1917 г.[34] і на рашэнні якога моцна паўплывалі „маскоўскія беларусы” (маскоўская Беларуская народная грамада) з Аляксандрам Цвікевічам. На Магілёўскім агульным сходзе Беларускага Нацыянальнага Саюза прысутнічалі дэлегаты ад аршанскай і гомельскай арганізацый. Магілёўцы пасля абмеркавання таксама пагадзіліся на фарміраванне адзінага спісу. Пад нумарам першым быў зацверджаны прадстаўнік Масквы (А. Цвікевіч), № 2 ад Оршы (М. Р. Ляўковіч), № 3 ад Магілёва (М. Кахановіч), № 4 ад Гомеля (Д. Г. Гулевіч) і г.д. Пад час сходу аршанец М. Ляўковіч адзначыў: „Местная интеллигенция мало уделяет внимания национальному движению, но скоро наступит время, когда мы все возьмем в свои руки. Нам необходимо объединиться и привлечь крестьянскую среду, пробудив в них народное самосознание” і далей, пры абмеркаванні пытання правядзення з’езда беларускіх арганізацый, прапанаваў: „центром Белоруссии сделать Могилев и по этой причине провести съезд”[35]. Беларускія арганізацыі Падняпроўя прапаноўвалі склікаць 5 студзеня 1918 г. у Магілёве з усёй Беларусі прадстаўнікоў земстваў, гарадскіх дум, саветаў, беларускіх партый і арганізацый і ўтварыць тут часовы орган кіравання краем — Беларускі народны савет. Яго галоўная місія палягала б у правядзенні выбараў у пастаянны орган улады — Беларускую краёвую думу. Гэта быў адзін з праектаў стварэння ў Беларусі самастойнай сістэмы ўлады[36].

31 И. И. Филиппович, *Могилев. Хроника событий 1917-1918...*, с. 24.

32 *Белорусский список (№ 8)*, „Горецкий вестник”, 1917, 3 ноября, с. 2.

33 БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 49-50 адв. Протокол общего собрания Белорусского Национального Союза от 12.10.1917 г.

34 Там жа, спр. 137, арк. 9. Исходящий журнал МБК, 1917 г.

35 Там жа, спр. 136, арк. 50-50 адв. Протокол общего собрания Белорусского Национального Союза от 12.10.1917 г.

36 С. Рудовіч, *У пошуках нацыянальнай ідэнтычнасці: Беларуская патрыятычная арганізацыя ў Магілёве...*, с. 208-209.

Магілёў мог стаць не толькі краёвым цэнтрам, але і сталіцай Беларусі (аўтаномнай адміністратыўнай адзінкі або самастойнай дзяржавы). У 1930-я гг. савецкія ўлады звярнуліся да падобнага праекта і паспрабавалі пераўтварыць Магілёў у сталіцу БССР. 19 кастрычніка 1937 г. бюро ЦК КП(б)Б пастанавіла „лічыць мэтазгодным перанесці сталіцу з Мінска ў Магілёў", 19 красавіка 1938 г. адпаведную пастанову СНК СССР і ЦК УКП(б) падпісалі Вячаслаў Молатаў і Іосіф Сталін[37]. І толькі падзеі пачатку Другой сусветнай вайны перашкодзілі гэтаму.

20 кастрычніка 1917 г. на пасяджэнні МБК выступіў прадстаўнік сацыял-дэмакратаў і БУНДа Сяўрук, які прапанаваў аб'яднанне беларускага і іх спісаў у адзін[38]. Але гэтая прапанова не знайшла падтрымкі з боку беларусаў Гомеля, Магілёва і Оршы.

Вынікі выбараў ва Устаноўчы сход для беларускіх арганізацый былі няўдалыя, перамогу атрымалі агульнарасійскія партыі: эсэры, бальшавікі і іншыя[39]. Аднак фарміраванне асобнага спісу ад беларусаў дазволіла выйсці на новы, агульнарасійскі ўзровень палітычнай дзейнасці беларускіх арганізацый Усходняй Беларусі. Дзякуючы перадвыбарчай агітацыі праграмныя палажэнні МБК сталі больш шырока вядомыя грамадскасці, што дазволіла ў будучым аказваць значны ўплыў на палітычную сферу Магілёва і губерні, узрасла роля камітэта ў працэсе фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў Магілёўшчыны.

У той жа час МБК супольна з Цэнтральнай Радай Беларускіх Арганізацый[40] беспаспяхова ініцыяваў перад Стаўкай Вярхоўнага галоўнакамандавання Расійскай імперыі правядзенне ў Магілёве з'езда беларускіх вайсковых арганізацый. 15 кастрычніка 1917 г. упаўнаважаны ЦРБА М. Кахановіч атрымаў тэлеграму ад начальніка асобага аддзела кіравання Генеральнага Штаба падпалкоўніка Новікава (у перакладзе на беларускую мову): „Па загадзе памочніка начальніка штаба Вярхоўнага Галоўнакамандуючага паведамляю Вам, што на запыт аб дазволе на скліканне 15 кастрычніка з'езда прадстаўнікоў беларускіх вайсковых арганізацый атрымана наступная тэлеграма ад Начальніка Ваеннага Кабінета Міністра-Старшыні і Вярхоўнага Галоўнакамандуючага: Глаўка-

[37] Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці, ф. 11, воп. 1, спр. 64, арк. 8-11. Пастанова СНК СССР і ЦК УКП(б).

[38] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 51. Пратакол пасяджэння МБК 20.10.1917 г.

[39] Д. С. Лавринович, *Либеральные организации России и белорусский национальный вопрос в 1917 г.*, „Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі", 2012, № 1, с. 9.

[40] LMAVB RS, f. 21, vnt. 2209, lap. 3. Ліст Цэнтральнай Рады Беларускіх Арганізацый Упаўнаважанаму выканаўчага камітэта ЦРБА М. Кахановічу ад 22.09.1917 г.

верх загадаў адмовіць у правядзенні з’езда беларускіх вайсковых арганізацый з-за цяжкага становішча Паўночнага фронта. 12.10.1917 г.”[41]

26 кастрычніка 1917 г. камісар Часовага ўрада па Магілёўскай губерні Р. Пеўзнер склікаў нараду палітычнага актыву Магілёва. Беларускі камітэт рэпрэзентаваў новы кіраўнік — М. Кахановіч. Сугучна большасці выступоўцаў ён назваў бальшавіцкае паўстанне злачынствам і контррэвалюцыйным актам.

28 кастрычніка 1917 г. на тэрыторыі Магілёўскай губерні для супрацьдзеяння бальшавікам былі створаны Магілёўскі гарадскі камітэт выратавання Радзімы і рэвалюцыі і Магілёўскі губернскі камітэт грамадскай бяспекі. У склад апошняга ўваходзілі: магілёўскі губернскі камісар Р. Пэўзнер (старшыня), ад гарадскога самакіравання — член управы Я. Локшын, ад губернскай польскай рады — шляхціц Р. Выгоўскі, ад партыі кадэтаў — ваенны інжынер Папоў, ад энесаў — земскі батанік Р. Крэйер, ад беларускага камітэта — выкладчык рэальнага вучылішча М. Кахановіч, ад сацыял-дэмакратаў, меншавікоў і БУНДа — Браўн, ад губернскага земства — член управы І. Кірыкос, ад кааператыўных арганізацый горада Магілёва і губерні — член губернскай харчовай управы Д. Каваленка, ад яўрэйскай народнай партыі — А. Сыркін, ад яўрэйскай сацыялістычнай рабочай партыі — Г. Гурэвіч, ад саюза паштова-тэлеграфных служачых — Пражэнік і ад губернскага Савета сялянскіх дэпутатаў — Рыжанкоў і Патапаў[42].

У снежні 1917 г. Магілёўскі Беларускі Камітэт паведаміў, што Камітэт пераўтвараецца ў Раду, для якой выпрацоўваецца новы статут[43]. У Выканаўчы камітэт Магілёўскай Беларускай Рады ўвайшлі: М. Кахановіч — старшыня, Дз. Даўгяла, В. Какашынскі — таварышы старшыні, Д. Аляхновіч — сакратар, Ф. Ляхтановіч — скарбнік[44].

МБК актыўна далучыўся да падрыхтоўкі першага агульнанацыянальнага форуму беларусаў — Усебеларускага з’езда ў снежні 1917 г. У адозве, выдадзенай ім з гэтай нагоды, звярталася ўвага на тое, што ў барацьбе за лепшую будучыню „беларускі народ быў цярплівы”. Але „разлад, унесены ў апошні час у шэрагі рускай дэмакратыі”, пагражае поўным развалам і анархіяй усёй дзяржаве. Такая небяспека штурхае „сыноў шматпакутнай Беларусі ўзяць на сябе задачу захавання цэласнасці сваёй радзімы і здабытых свабод ад замахаў, з чый-

[41] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 137, арк. 98. Телеграмма.

[42] М. Н. Железняк, *Комитеты спасения революции на территории современной области после захвата власти в России большевиками*, [у:] *Романовские чтения — 3: сборник трудов Международной научной конференции*, Могилёв 2007, с. 11.

[43] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 137, арк. 50. Ліст МБК.

[44] LMAVB RS, f. 21, vnt. 2071, lap. 4-6. Спіс членаў МБР.

го б боку яны ні зыходзілі”. У Магілёве 1 снежня 1917 г. а 18 гадзіне ў зале Гарадской думы адбыўся сход беларусаў, на які МБК (МБР) запрасіў Выканаўчы камітэт Магілёўскага губернскага савета сялянскіх дэпутатаў[45].

На сходзе быў прыняты „Наказ от Могилевской Белорусской Рады делегату на Всебелорусский Съезд в Минске. 1) По вопросу „Международное положение Белорусии” (Война и мир). Исполнительный Комитет Могилевской Белорусской Рады находит, что разоренная и опустошенная 3-х летней войной Белоруссия должна быть восстановлена и весь Белорусский народ объединен в одну целую автономную единицу, входящую как равноправный член в единую демократическую федеративную Российскую Республику, для чего Исполнительный Комитет настаивает на необходимости представительства от Белорусского народа на международной мирной конференции или о решении вопроса о самоопределении народности, дабы этим путем вопрос о самоопределении Белорусского народа был поставлен в международном масштабе. Вместе с воинами беларуссами Северного фронта, Исп[олнительный] Ком[итет] Мог[илевской] Белор[усской] Рады поддерживает категорический протест по поводу появляющихся захватнических намерений со стороны империалистически настроенных соседей, выносит свой протест на Суд Российской Революционной Демократии и Западно-Европейской демократии и полагает, что Международная Демократия, при разрешении спора на предстоящей Мирной Конференции, будут руководствоваться Общедемократическим Критерием — пределами этнографического расселения этого или иного народа при установлении на будущей карте Европы новых границ самоопределяющихся народов Восточной, Западной и Южной Европы”[46].

Наяўныя крыніцы вельмі фрагментарна адлюстроўваюць удзел прадстаўнікоў магілёўскай арганізацыі ва Усебеларускім з’ездзе. Вядома толькі, што Дз. Даўгяла меўся зрабіць даклад аб стане народнай адукацыі ў краі, а М. Кахановіч на адным з пасяджэнняў выступіў з заклікам не адкладваць справу самавызначэння, „бо за нас можа вырашыць Вільгельм ці польскія легіёны”[47].

45 БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 137, арк. 39. Ліст МБК ад 1.12.1917 г. у Выканаўчы камітэт Магілёўскага губернскага савета сялянскіх дэпутатаў; LMAVB RS, f. 21, vnt. 2229, lap. 3. Зварот Выканаўчага камітэта МБР да беларусаў на сход па выбарах дэлегатаў на Усебеларускі з’езд.

46 LMAVB RS, f. 21, vnt. 2218, lap. 38-39, 43-43 адв. Наказ Магілёўскай Беларускай Рады дэлегатам Усебеларускага з’езда. 5.12.1917 г. Друкаваны і рукапісны варыянты.

47 С. Рудовіч, *У пошуках нацыянальнай ідэнтычнасці: Беларуская патрыятычная арганізацыя ў Магілёве...*, с. 203-209.

У архівах захаваліся некалькі дакументаў: пасведчанне МБК № 221 ад 2.12.1917 г. аб дэлегаванні ад МБК на з'езд Д. Аляхновіча (спачатку яно было выпісана на імя М. Кахановіча)[48], пратакол пасяджэння Выканаўчага камітэта Магілёўскай Беларускай Рады ад 24.12.1917 г. (?) аб вылучэнні дэлегатамі на з'езд М. Кахановіча і В. Какашынскага[49] і ліст № 518 ад 9.12.1917 г. М. Кахановічу ад Беларускай Цэнтральнай Вайсковай Рады за подпісам С. Рак-Міхайлоўскага з інфармацыяй аб адкрыцці з'езда і прыпіскай „прошу сделать все возможное от Вас к тому чтобы делегаты от Могилевской губернии прибыли"[50]. Гэта дазваляе зрабіць выснову аб тым, што не ўсе дэлегаты ад МБК і беларускіх арганізацый губерні ўдзельнічалі ў працы з'езда ад яго пачатку.

На нарадзе дэлегатаў Усебеларускага з'езда ў Мінску ўвечары 5 снежня 1917 г. было прапанавана стварыць Часовую Раду з'езда, якая складалася з прадстаўнікоў ад найбуйнейшых арганізацый і партый Беларусі. Ад павятовых і губернскіх земстваў быў абраны Д. Васілеўскі, ад валасных земстваў Магілёўскай губерні З. Міхайлаў[51], які быў членам партыі бальшавікоў[52].

Усебеларускі з'езд распачаў працу 7 снежня. Прагучалі прывітальныя тэлеграмы, у тым ліку ад Булгака з Магілёва. Адбыліся выступы з вітаннямі ад мусульман Беларусі, ад БУНДа і г.д.[53] На наступны дзень на з'ездзе выступіў дэлегат ад імя сялян Магілёўскай губерні. З яго прамовы можна прасачыць пазіцыю сялянства, якая істотна адрознівалася ад поглядаў патрыятычна настроенай часткі інтэлігенцыі краю. Ён заклікаў, каб на з'ездзе не было расколу, што неабходна дзейнічаць супольна. Выказаўся і наконт мовы: „не следует созерцаться к прошлому, что было 400 лет тому назад"[54].

Усебеларускі з'езд быў гвалтоўна разагнаны бальшавікамі 17 снежня 1917 г. Варта адзначыць неадназначныя адносіны насельніцтва Магілёўшчыны да з'езда. У адрозненні ад інтэлігенцыі, якая ў большасці вітала правядзенне з'езда і прынятыя ім рэзалюцыі, Магілёўскі агульнагубернскі з'езд сялянскіх дэпутатаў (15-18.12.1917) у сваёй рэзалюцыі „Аб Усебеларускім з'ездзе" пастанавіў: „Склікаць 2-гі Усе-

[48] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 137, арк. 18. Исходящий журнал МБК, 1917 г.; там жа, арк. 40. Пасведчанне МБК.

[49] Там жа, спр. 136, арк. 56-56 адв. Пратакол пасяджэння ВК МБР 24.12.1917 г.

[50] LMAVB RS, f. 21, vnt. 2209, lap. 2. Ліст Беларускай Цэнтральнай Вайсковай Рады.

[51] *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі*, т. 1, кн. 1, с. 15-16.

[52] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 137, арк. 3 адв. Исходящий журнал МБК, 1917 г.

[53] LVCA, f. 582, ap. 1, b. 1, lap. 5-8. Пратаколы пасяджэнняў Усебеларускага нацыянальнага з'езда.

[54] *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі*, т. 1, кн. 1, с. 31.

беларускі з’езд саветаў сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў (...) сцвердзіць уладу працоўнага народа па ўсёй Беларусі і яе безумоўнай неадрыўнасці і неадчужальнасці ад маці — Расіі (...). Дэлегатамі на з’езд лічыць прадстаўнікоў саветаў, а не самазваных Беларускіх Рад і Грамад”[55].

Вынікі з’езда былі заслуханы на пасяджэнні Выканаўчага камітэта Магілёўскай Беларускай Рады (ВК МБР), якое адбылося 3 студзеня 1918 г. у кватэры М. Кахановіча. Сярод іншага былі заслуханы даклады аб з’ездзе Д. Аляхновіча і М. Кахановіча. Першы падрабязна распавёў пра адкрыццё з’езда і першыя пасяджэнні, падкрэсліў „большое значение Съезда в деле популяризации идеи автономии Белоруссии”, далей паведаміў аб пасяджэннях пасля разгону з’езда. Абмеркавалі праект рэзалюцыі з’езда аб арганізацыі Краёвай улады ў Беларусі. М. Кахановіч прапанаваў „принять резолюцию протеста против разгона Съезда и вообще против препятствия самоопределению Белоруссии и распространить ее в Могилевской губернии, а также послать во все места Российской Республики”[56].

У апошні год Першай сусветнай вайны актывізаваўся працэс стварэння новых еўрапейскіх дзяржаў. Узнікненне дзяржаў было не столькі вынікам дзейнасці нацыянальных эліт, колькі адпавядала інтарэсам такіх дзяржаў як Францыя, Вялікабрытанія, ЗША, савецкая Расія, Германія.

Улічваючы тагачасную палітычную сітуацыю ў Еўропе і Расіі, варта найперш прыпыніцца на пазіцыях МБК у адносінах да дзеянняў кіраўніцтва і нацыянальных рухаў Германіі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны.

Аналіз статута, заяў і дакументаў аб дзейнасці дазваляюць сцвярджаць, што МБК прытрымліваўся ў нацыянальным кірунку пакрокавай стратэгіі, паступова прайшоўшы ад аўтаноміі ў складзе Расійскай імперыі да ідэй незалежнасці БНР. Гэта было выклікана часам, станам грамадства, унутры- і знешнепалітычнымі прычынамі. Падобнае адбывалася і ў іншых рэгіёнах былой Расійскай імперыі.

Першы крок быў арыентаваны на Расію. Планавалася аб’яднаць беларускі народ на ўсёй тэрыторыі этнічнага рассялення ў складзе асобнай (пакуль што аўтаномнай) адміністратыўнай адзінкі са сваімі органамі ўлады (мясцовым самакіраваннем), што паспрыяе нацыянальна-культурнаму адраджэнню і асабовай ідэнтыфікацыі асноўнай масы насельніцтва. Вырашэнне гэтай задачы ставілася перад нацыяналь-

[55] LVCA, f. 582, ap. 2, b. 11, lap. 34. Рэзалюцыя з’езда.

[56] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 58-59 адв. Пратакол пасяджэння ВК МБР ад 03.01.1918 г.

най элітай, якая знаходзілася ў стадыі стварэння. Ёй, тэарэтычна, было ўласціва пачуццё дзяржаўнасці, якое непазбежна пераўтвараецца ў імкненне да стварэння самастойнай, незалежнай дзяржавы.

Першапачатковыя праграмныя мэты МБАК былі апублікаваныя ў красавіку 1917 г. (у перакладзе на беларускую мову): „У мэтах аб'яднання ўсяго беларускага народа камітэт вызначыў наступныя задачы: а) аказваць падтрымку Часоваму ўраду ў барацьбе са знешнім ворагам у справе добраўладкавання Расіі на пачатках дэмакратычнай рэспублікі; б) арганізаваць выбары ва Усерасійскі Устаноўчы сход; в) распрацаваць праграму дзеянняў, якая павінна быць зацверджана Устаноўчым сходам і адпавядаць нацыянальным імкненням беларускага народа; г) эканамічна і культурна добраўпарадкаваць Беларусь"[57].

Крыху пазней яны загучалі наступным чынам (у перакладзе на беларускую мову): „1) Дзяржаўны лад. Расійская дзяржава аб'яўляецца федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікай. 2) Зямля. Уся зямля пераходзіць у рукі працоўнага народа і ў нашым краі (Беларусі) перадаецца ў прыватную ўласнасць, беззямельныя і малазямельныя надзяляюцца зямлёй. 3) Воля. Замацаванне сапраўдных свабод, свабода сходаў, слова, друку і інш. 4) Вайна. Найхутчэйшае заканчэнне вайны ў поўнай згодзе з саюзнікамі. 5) Асвета. Бясплатная ўсеагульная адукацыя. Адкрыццё ў вясковай мясцовасці, краі пачатковых, сярэдніх і спецыяльных навучальных устаноў, універсітэта і вышэйшых навучальных устаноў. 6) Правы народаў. Усе народы, якія жывуць у Расіі маюць роўныя правы"[58]. Можна лічыць, што паводле светапогляду ў МБАК былі пераважна прыхільнікі ліберальных каштоўнасцей, што магло зблізіць іх з агульнарасійскай партыяй канстытуцыйных дэмакратаў. Аднак кадэцкія арганізацыі, якія пасля лютаўскай рэвалюцыі пачалі дзейнічаць у Беларусі, не прызнавалі за беларускім народам яго права на нацыянальна-культурную аўтаномію і лічылі, як і ідэолагі заходнерусізму, што беларусы арганічна ўваходзяць у склад „адзінага рускага народа"[59]. Нежаданне кадэтаў ісці на ўступкі ў нацыянальным пытанні перашкаджала збліжэнню з імі кіраўнікоў Магілёўскага Беларускага Камітэта.

У той жа час на эвалюцыю поглядаў лідараў МБК паўплывала праграма Беларускай сацыялістычнай грамады, якая прапагандавалася прадстаўнікамі БСГ на з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый (Мінск, 25-27.03.1917), на якім быў М. Кахановіч і дэлегаты ад МБК.

[57] *Заявление МБАК*, „Могилевский вестник", 1917, 20 апр., с. 1; *Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII — пачатку XXI ст. У 2 кн.*, кн. 1, Мінск 2011, с. 323.

[58] LMAVB RS, f. 21, vnt. 2218, lap. 19-20. Рукапіс праграмных мэтаў МБАК, 1917 г.

[59] *Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII — пачатку XXI ст...*, с. 315.

На пасяджэннях МБК абмяркоўвалася пытанне аб супрацоўніцтве з рознымі палітычнымі партыямі і арганізацыямі. У чэрвені 1917 г. Кахановіч, Кміта і Аляхновіч былі выбраны дэлегатамі ад МБК у выканаўчыя камітэты мясцовых арганізацый эсэраў і сацыял-дэмакратаў[60].

Даследчык С. Рудовіч сцвярджае, што „магілёўская суполка не мела сталай праграмы, але калектыўныя заявы і індывідуальныя выступленні яе сяброў, практычная дзейнасць, безумоўна, сведчылі пра шчырую зацікаўленасць у эканамічным і культурным прагрэсе краю, у здабыцці беларусамі годнага месца ў міжнародным супольніцтве народаў”[61].

У першыя месяцы існавання пазіцыя МБК была выключна памяркоўнай і па некаторых пытаннях не зусім акрэсленай. Сцвярджалася, што Беларусь мае свае асобныя, мясцовыя, нацыянальныя патрэбы, і таму беларусам неабходна згуртавацца ў цесную нацыянальную супольнасць. Адносна Беларусі гаворка ішла пра тое, што яе належыць вылучаць у самастойную адміністрацыйную адзінку, што кіраваць ёю павінны асобы з асяроддзя самога насельніцтва Беларусі, для чаго трэба ўтварыць мясцовы заканадаўчы орган і дакладна размежаваць кампетэнцыю паміж ім і агульнадзяржаўнымі органамі[62].

Падобнае яшчэ можна знайсці ў праекце статута 1918 г. Магілёўскай Беларускай Рады (у перакладзе на беларускую мову): „Асноўнай мэтай Рады з'яўляецца нацыянальна-культурны росквіт беларускага народа. Найбліжэйшая мэта — нацыянальна-тэрытарыяльная аўтаномія Беларусі (...). Для культурнага росквіту Беларускага народа Рада садзейнічае ўтварэнню спрыяльных для культурнага развіцця Беларускага народа дзяржаўна-прававых, культурна-асветных і эканамічных умоў. Рада імкнецца развіваць у беларусаў пачуццё нацыянальнай самасвядомасці (...). Рада выдае газеты, брашуры, кнігі і часопісы ў адпаведнасці з яе мэтамі, а таксама садзейнічае выданням, якія падтрымліваюць беларускую нацыянальную ідэю. Рада садзейнічае эканамічнаму дабрабыту Беларускага народа, спрыяючы як мага больш шырокаму развіццю ў Беларусі кааперацыі (...). Сапраўднымі членамі Рады могуць быць карэнныя беларусы — асобы, у якіх хаця б тры апошнія пакаленні продкаў з боку бацькі альбо маці належылі да бе-

[60] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 33. Працаколы пасяджэння ад 7.06.1917 г.

[61] С. Рудовіч, *У пошуках нацыянальнай ідэнтычнасці: Беларуская патрыятычная арганізацыя ў Магілёве...*, с. 203-209.

[62] LMAVB RS, f. 21, vnt. 2218, lap. 32-32 адв. Праграмныя палажэнні палітычнай секцыі МБК наконт дзяржаўнага ладу Расіі; БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 21. Працакол сходу МБАК ад 18.04.1917 г.

ларускай народнасці і мелі ўзрост не менш за 20 гадоў. Членамі-спаборнікамі могуць быць асобы, якія адпавядаюць патрабаванням п. 2, але не дасягнулі 20 год (...). Рада мае пячатку з надпісам „Магілёўская Беларуская Рада” (...)”[63].

Цікавым выглядае стаўленне МБК да беларускай мовы. У сваім справаводстве і зваротах да насельніцтва ён карыстаўся пераважна рускай мовай. Захавалася значная частка пратаколаў МБК на „беларускай мове” (у аснове якой была мясцовая беларуская гаворка, галоўным чынам усходніх, левабярэжных паветаў Магілёўшчыны). Упершыню моўная праблема стала прадметам шырокага абмеркавання на пасяджэнні агульнага сходу 7 чэрвеня 1917 г. Пры разглядзе даклада аб выданні газеты паўстала пытанне: на якой мове будуць публікавацца матэрыялы. Прагучала меркаванне „против издания газеты на русском языке, потому что этим руссифицируем Белорусь, а издавать газету на таком белорусском языке, на каком издается Минская газета „Громада” тоже нельзя, потому что язык такой больше не понятен, чем русский. Г. Коханович заявил, что он предлагает издавать газету на литературном русском языке — на белорусском языке помещать фельетоны и картинки из местной жизни. А. Пигулевский заявил (...) издавать на простом понятном русском языке”[64].

Ад пачатку сваёй дзейнасці членамі МБК прызнавалася неабходнасць выкладання ў народных класах на беларускай мове, увядзенне ў вышэйшых пачатковых і сярэдніх вучэбных установах у якасці неабавязковага прадмета вывучэнне беларускай мовы, гісторыі Беларусі, этнаграфіі і геаграфіі краю. У той жа час на рускай мове МБК распрацавалі і аператыўна выдалі падрабязную праграму па курсе беларускай гісторыі[65].

На працягу лістапада 1917 г. МБК разаслаў па 2 асобнікі праграмы ў 78 навучальных устаноў Беларусі: Магілёва, Бабруйска, Віцебска, Рэчыцы, Мазыра, Нясвіжа, Слуцка, Оршы, Веліжа, Невеля, Нова-Вілейкі, Свянцян, Гарадка, Мсціслаўля, Полацка, Мінска, Барысава, Рагачова, Клімавіч і іншых[66]. У сваіх лістах МБК паведамляў наступнае (у перакладзе на беларускую мову): „Дасылаем 2 асобнікі „Праграмы Беларускага народа”, выдадзенай Камітэтам. Магілёўскі Беларускі Ка-

[63] LMAVB RS, f. 21, vnt. 2071, lap. 7-8. Праект Статута Магілёўскай Беларускай Рады.

[64] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 32-32 адв. Пратаколы пасяджэння 7.06.1917 г.

[65] *Программа по истории Белорусскаго народа. Для средних учебных заведений, учительских институтов, семинарий и для самообразования. Издание Могилевскаго Белорусскаго Национальнаго Комитета*, Могилев на Днепре 1917.

[66] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 137, арк. 10-17. Исходящий журнал МБК, 1917 г.

мітэт звяртаецца з просьбай да Педагагічнай рады Вашай вучэбнай установы аб увядзенні ў бягучым навучальным годзе выкладання гісторыі Беларускага народа, згодна пастановы З'езда дырэктараў і навучэнцаў, які быў у Магілёве ў ліпені месяцы. За праграмы вышлеце Камітэту 1 (адзін) рубель. Старшыня М. Кахановіч. Сакратар Аляхновіч"[67]. У некаторых навучальных установах іх прапанова знайшла падтрымку педагагічных калектываў: Нова-Вілейскай настаўніцкай семінарыі, Слуцкай жаночай дзяржаўнай гімназіі, Барысаўскай жаночай настаўніцкай семінарыі, Быхаўскай жаночай гімназіі, Быхаўскай мужчынскай настаўніцкай семінарыі і іншых[68].

Нявызначанасць па моўным пытанні заставалася нязменнай на працягу ўсяго перыяду існавання МБК. Можна вылучыць два падыходы ў іх адносінах да беларускай мовы: 1) мова як сродак адукацыі і адраджэння самасвядомасці; 2) выкарыстанне мовы ў якасці афіцыйнай (дзяржаўнай). Аб гэтым сведчыць пастанова ВК МБР ад 5 чэрвеня 1918 г.: „Приветствуя возрождение белорусского народного языка и расцвет белорусской литературы, поэзии и искусства, Комитет считает введение белорусского языка как обязательного в государственное делопроизводство преждевременным"[69].

Прыход да ўлады бальшавікоў падштурхнуў Магілёўскі Беларускі Камітэт далучыцца да Вялікай Беларускай Рады і разам з іншымі беларускімі арганізацыямі напрыканцы кастрычніка 1917 г. падпісаць Грамату да Беларускага Народа з заклікам „сабраць усе жывыя сілы нашае Бацькаўшчыны дзеля абароны і ўтрымання нашых вольнасцяў (...) верыць у сілу і мудрасьць беларускаго народу, у руках каторага вялікая будучыня Вольнай Беларусі"[70].

У выніку ўнутрыпалітычнага (неабходнасць нацыянальна-культурнага і эканамічнага адраджэння) і знешнепалітычнага (захопніцкія памкненні з боку Германіі, Савецкай Расіі і Польшчы) стану беларускай справы, погляды членаў МБК (МБР) у 1917-1918 гг. істотна і хутка эвалюцыянуюць ад аўтаноміі да незалежнасці.

Наступны крок дзейнасці МБК у нацыянальным кірунку тычыўся працэсу стварэння ў гэты час (з дапамогаю краін Антанты і нацыянальна-патрыятычнай часткі інтэлігенцыі) Польскай дзяржавы.

67 Там жа, арк. 49. Ліст Магілёўскага Беларускага Камітэта.

68 Там жа, арк. 105. Ліст ад 20.11.1917 г. у МБК ад дырэктара Нова-Вілейскай настаўніцкай семінарыі.

69 Там жа, спр. 136, арк. 74. Пратакол № 5 пасяджэння Выканаўчага камітэта МБР ад 5.06.1918 г.; *Местная жизнь. В исполнительном комитете могилёвской белорусской рады*, „Труд", 1918, № 85, 13(01) июня, с. 4.

70 LMAVB RS, f. 21, vnt. 2218, lap. 28a-28в. Грамата да Беларускага Народу ад 27.10.1917 г.

Пазіцыя МБК у гэты перыяд не была стабільнай і ўпэўненай: „З Магілёва пішуць, што тамашнія беларусы раздзяліліся на дзве часьціны: адна прыхільная да палякаў, другая да расейцаў. Ад рэдакцыі: Дзіва: беларусамі празываюцца, а цягнуць да расейцаў, або да палякаў. Дык навошта ж звацца беларусамі?”[71]

Варта адзначыць, што ў польскай і беларускай грамадскасці Магілёўскай губерні погляды на будучыню Беларусі практычна супадалі. Падчас Першай сусветнай вайны ў Магілёве дзейнічалі наступныя польскія арганізацыі (акрамя рэлігійных): Польскі вайсковы саюз, Польскі рабочы саюз, Польскае таварыства дапамогі ахвярам вайны, Цэнтральны абывацельскі камітэт, Польскае таварыства асветы і дабрачыннасці. 8-11 чэрвеня 1917 г. у Магілёве прайшоў 2-гі Польскі з’езд, на якім прысутнічалі 170 дэлегатаў ад грамадскіх арганізацый і ўстаноў, польскіх павятовых рад. На з’ездзе быў сфарміраваны пастаянны орган — Выканаўчы камітэт. У пастанове адзначалася: „Съезд, ставя высоко работу белорусских национальных организаций на пользу края, постановил присоединиться к их требованиям автономии для Белоруссии”[72]. Прадстаўнікі Магілёўскай польскай рады, выбраныя ў Гарадскую думу, неаднаразова падтрымлівалі або сумесна дзейнічалі з Беларускім камітэтам гласных Гарадской думы г. Магілёва[73].

Моцна паўплывалі на прапольскія настроі МБК кароткачасовае ўсталяванне ў Магілёве савецкай улады (узурпаванай бальшавікамі) і пазіцыя камандзіра І Польскага корпуса генерала Ю. Доўбар-Мусніцкага. Ён быццам прыхільна ставіўся да самавызначэння беларусаў і да ідэі стварэння незалежнай БНР. 25 студзеня 1918 г. нават выдаў адозву „Братья — Белоруссы”: „Не полякам, ценящим свободу дороже жизни и проливавшим за неё кровь в течении последних 150 лет, лишать свободы своих братьев, с которыми они жили на одной земле. Наоборот, мы готовы предоставить вам возможность собрать разогнанную притеснителями свободы Белорусскую Раду в Бобруйске, где под покровительством наших войск они свободно и беспрепятственно смогут обсудить свои дела. Мы в ваши внутренние дела вмешиваться не будем (...). Да здравствует свободная Белоруссия”[74]. З другога боку, пасля таго як 12 сакавіка 1918 г. войскі корпуса занялі Магілёў, на будынку ратушы была ўсталявана дошка аб аднаўленні Рэчы Паспалітай у межах 1772 года.

[71] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НАРБ), ф. 325, воп. 1, спр. 19, арк. 275. Хроніка падзей да беларускіх газет.

[72] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 40 адв. Пратакол пасяджэння МБК ад 17.06.1917 г.

[73] *Местная жизнь. Городская дума. Белорусский вопрос*, „Труд”, 1918, № 98, 26 (13) июня, с. 3.

[74] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 19, арк. 166-167. Адозва «Братья — Белоруссы».

Таксама абуралі насельніцтва Магілёўшчыны паводзіны камандавання і жаўнераў корпуса. Юзаф Доўбар-Мусніцкі на пасяджэнні Бабруйскай павятовай земскай управы гаварыў, „што калі палякам патрэбны будуць грошы, то яны іх возьмуць з жыхароў хоць сілаю". У Магілёве пад эгідаю польскіх улад быў распачаты манапольны гандаль гарэлкай, усе прыбыткі ішлі на карысць корпуса, аб чым быў накіраваны пратэст польскаму выканаўчаму камітэту ў Кіеве[75].

У той жа час, менавіта ва ўмовах знаходжання ў Магілёве польскага корпуса, у Выканаўчага камітэта МБР выспела ідэя правядзення прадстаўнічага форуму, на якім планавалася абмеркаваць апошнія палітычныя падзеі ў Беларусі. 28 сакавіка 1918 г. на пасяджэнні ВК МБР абмяркоўваўся праект павесткі агульнага сходу членаў МБР з удзелам дэлегатаў ад губернскіх і павятовых земстваў, гарадскога самакіравання, прадстаўнікоў устаноў, грамадскіх нацыянальных і прафесійных арганізацый, палітычных партый. Цікавай выглядае прапанова ВК МБР, якую планавалі абмеркаваць на сходзе: „Организовать в Могилеве Совет, который бы состоял из представителей национальностей населяющих Мог[илевскую] губ[ернию] пропорционально числу жителей каждой национальности с решающем голосом и представителей земств, городов, правительственных и общественных учреждений, профессиональных организаций и политических партий с совещательным голосом. Совет этот не имеет официального характера, должен содействовать своими постановлениями объединению Белорусского Края, созданию Центральной власти в Крае, а также влиять в этом направлении на деятельность перечисленных выше организаций и груп"[76]. Аднак на агульным сходзе асноўным стала зусім іншае пытанне. Стала вядома аб абвяшчэнні ў Мінску Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР).

31 сакавіка 1918 г. па ініцыятыве МБК у памяшканні акруговага суда, які тады размяшчаўся ў будынку Марыінскай жаночай гімназіі (сёння СШ № 1 г. Магілёва)[77], адбыўся сход прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, партый і ўстаноў мясцовага кіравання (прысутнічала каля 400 чалавек)[78].

На сходзе асноўныя падзеі разгарнуліся пры абмеркаванні пытання арыентацыі Беларускай Народнай Рэспублікі: „Одни ораторы полагали, что Белоруссия не должна отделяться от Великороссии, другие

[75] *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі*, т. 1, кн. 1, с. 154-155.

[76] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 65адв.-67. Пратакол пасяджэння ВК МБР ад 28.03.1918 г.

[77] У некаторых публікацыях, якія грунтаваліся на пазнейшых успамінах М. Кахановіча, недакладна паведамляліся дата і месца сходу.

[78] LVCA, f. 582, ap. 2, b. 65, lap. 1-26. Мандаты дэлегатаў сходу.

подчеркивали необходимость ориентации на Запад и, наконец, третьи громадное большинство — указывали на то, что ориентация должна быть только местная, национально — Белорусская"[79]. У выніку для галасавання было прапанавана адказаць на тры пытанні. Вось два першыя: „1. Признает ли собрание желательным и необходимым установление Белорусской Народной Республики? 2. Признает ли собрание необходимым организацию на демократических началах центральной Белорусской Рады в Минске, как верховного органа управления краем?"[80]. Амаль аднагалосна было падтрымана стварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі і прызнанне ўлады Цэнтральнай Беларускай Рады ў Мінску як органа кіравання ўтворанай дзяржавы на тэрыторыі ў межах рассялення беларускага народа[81]. Прычыны падтрымкі былі розныя — гэта тэма асобнага даследавання.

5 карсавіка 1918 г. Язэп Варонка, старшыня Народнага Сакратарыята і народны сакратар замежных спраў Беларускай Народнай Рэспублікі, пісаў з Мінска ў Вільню Івану і Антону Луцкевічам: „Незалежнасць — цяжкая і адветная праца, а сіл у нас мала (...). Учора ужэ завязалі стасункі з Магілёвам і там усё добра: земства, горад і магілёўская беларуская рада (галава Кахановіч) стояць за нас"[82].

У красавіку 1918 г. Народны Сакратарыят БНР распачынае справу стварэння Беларускіх рад як органаў мясцовага самакіравання, у тым ліку і на тэрыторыі Магілёўшчыны. 28 мая 1918 г. НС БНР даручыў ксяндзу Аляксандру Астрамовічу (пробашч парафіі ў Абольцах Аршанскага дэканата) і Я. Насовічу арганізаваць мястэчковыя, павятовыя і губернскія рады ў раёнах Магілёўскай губерні[83]. 3 верасня 1918 г. НС БНР на сваім пасяджэнні заслухаў пісьмовы даклад кс. Астрамовіча і Я. Насовіча аб тым, як арганізоўваліся беларускія рады на Магілёўшчыне. У ім паведамлялася між іншым, што „сяляне адносяцца пакуль што недаверчыва, а польскія памешчыкі ўсімі сіламі ні давалі працаваць і нават пры помачы акупацыйнага начальства адабралі мандат на арганізацыю радаў"[84].

Улічваючы тагачаснае ваеннае становішча, спачатку адносіны МБК да акупацыйнага Германскага кіраўніцтва былі даволі памяркоўныя. Вельмі моцна на пазіцыі МБК паўплывалі ўмовы Брэсцкай мірнай да-

[79] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 68 адв. Пратакол агульнага сходу магілёўцаў ад 31.03.1918 г.

[80] Там жа, арк. 69. Пратакол агульнага сходу магілёўцаў ад 31.03.1918 г.

[81] Там жа, арк. 68-69. Ліст каменданту горада Магілёва. Пратакол агульнага сходу магілёўцаў ад 31.03.1918 г.

[82] *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі*, т. 1, кн. 1, с. 78.

[83] Там жа, с. 164.

[84] Там жа, с. 247.

мовы (3.03.1918) паміж Германіяй і РСФСР, змест дэкларацыі кайзера Германіі Вільгельма II (23.03.1918) аб прызнанні незалежнасці Літоўскай дзяржавы, у склад якой былі ўключаны і беларускія землі (Віленшчына, Гродзеншчына, Беласточчына), і абвяшэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі (25.03.1918).

21 мая 1918 г. германскае камандаванне аддала загад аб раззбраенні корпуса Доўбар-Мусніцкага, а 26 мая 1918 г. Магілёў быў заняты германскімі войскамі. Імкненне магілёўцаў да прызнання незалежнасці БНР як рэакцыі на дзеянні ўлад Савецкай Расіі і Германіі ў дачыненні да падзелу тэрыторыі Беларусі выклікала негатыўныя дзеянні з боку германскіх акупацыйных улад. Пачаўся працэс ліквідацыі („упразднения") Магілёва як губернскага цэнтра[85]. Выканаўчы камітэт Магілёўскай Беларускай Рады ў сувязі з дзеяннямі германскіх акупацыйных улад па ліквідацыі ў Магілёве акружнога суда і некаторых губернскіх устаноў, а таксама далучэнні акупаванай часткі Магілёўскай губерні ў судовым парадку да Мінскай губерні прыняў шмат намаганняў і дзеянняў па захаванні статуса і ролі горада Магілёва ў жыцці Беларусі. Лідары МБР настойліва і неаднаразова хадайнічалі перад германскімі акупацыйнымі ўладамі пакінуць у Магілёве губернскія ўстановы[86].

Беларусы — гласныя Гарадской думы — узнялі пытанне прызнання незалежнасці БНР галоўным прадстаўнічым органам улады горада Магілёва — Гарадской думай. 18 і 19 мая 1918 г. у магілёўскай газеце „Труд" былі апублікаваны матэрыялы да абмеркавання на пасяджэнні Гарадской думы пытанняў адносін да аб'яўлення незалежнасці БНР і падпарадкавання ЦБР БНР. У першым артыкуле, які меў станоўчы характар, распавядалася пра І Усебеларускі з'езд, устаўныя граматы, прынцыпы работы рады[87]. У другім артыкуле (аўтар той жа) — аб прыняцці і змесце 2 і 3 Устаўных грамат і паведамлялася, што яны не адпавядаюць пастановам Усебеларускага з'езда, гучала крытыка ў адрас „незалежнікаў". Аўтар артыкула выступаў за Беларусь як частку непадзельнай Вялікарасіі[88].

У адказ на публікацыі і грамадскія дыскусіі, каб захаваць прынцыпова важнае і суцішыць моўную праблему, 5 чэрвеня 1918 г. на пасяджэнні Выканаўчага камітэта МБР (прысутнічалі: М. Кахановіч, Дз.

[85] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 75. Пратакол пасяджэння ВК МБР ад 02.07.1918 г.

[86] *Местная жизнь. Исполнительный комитет могилёвской белорусской рады. Об упразднении губернских учреждений*, „Труд", 1918, № 120, 18 (05) июля, с. 3; БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 76. Пратакол пасяджэння ВК МБР ад 05.07.1918 г.; там жа, арк. 77-77 адв. Заява ВК МБР, 1918 г.

[87] *Белорусская рада и народный секретариат*, „Труд", 1918, № 59, 18 мая, с. 1-2.

[88] Там жа, № 60, 19 мая, с. 1-2.

Даўгяла, В. Какашынскі, Д. Аляхновіч, А. Ляхтановіч, Я. Аляхновіч, А. Плябанская, А. Семяненка, Л. Какашынскі) былі прыняты рашэнні: „1) В настоящий момент стремление к созданию независимой Белоруссии является весьма полезным для белорусского национального движения, и поэтому [Выканаўчы камітэт МБР] считает объявление в настоящее время Центральной Белорусской Радой независимости Белоруссии правильным и полезным для Белоруссии; 2) признавая необходимыми и неотложными аграрные реформы в Белоруссии вплоть до наделения безземельных белорусов землеробов землей за счет казенных земель и земель крупных частных владельцев, Комитет считает, что объявленное Центральной Белорусской Радой уничтожение частной собственности на землю не соответствует исторически сложившимся и существующим в настоящее время культурному и экономическому укладу жизни в Белоруссии; 3) приветствуя возрождение белорусского народного языка и расцвет белорусской литературы, поэзии и искусства, считает, что введение белорусского языка как обязательного в государственное делопроизводство преждевременным”[89].

26 чэрвеня 1918 г. адбыліся дэбаты ў Магілёўскай гарадской думе аб адносінах да Цэнтральнай беларускай рады ў Мінску. М. Кахановіч і прадстаўнік польскай рады выступілі з прамовамі за незалежнасць Беларусі, прадстаўнікі мясцовых кадэтаў, народнага саюза, БУНДа — супраць. Большасцю галасоў гарадская дума вырашыла не прызнаваць паўнамоцтвы беларускай рады ў Мінску і не пасылаць да яе дэлегатаў[90].

Выканаўчы камітэт Магілёўскай Беларускай Рады 2 ліпеня 1918 г. на сваім пасяджэнні разгледзеў пытанне аб сваіх адносінах да пастановы Магілёўскай гарадской думы аб непрызнанні Рады БНР[91] і вырашыў (у перакладзе на беларускую мову): „Магілёўская беларуская рада абмеркавала пастановы Магілёўскай гарадской думы аб адносінах да рады БНР і лічыць, што Магілёўская гарадская дума не адлюстроўвае мясцовай грамадскай думкі”[92].

Недзе паміж 5 і 11 ліпеня 1918 г. адбылася сустрэча прадстаўнікоў ВК МБР Я. Аляхновіча і У. Лукіна з мясцовым прадстаўніком германскіх

[89] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 73-74 адв. Пратакол № 5 пасяджэння Выканаўчага камітэта МБР ад 5.06.1918 г.; *Местная жизнь. В исполнительном комитете могилёвской белорусской рады*, „Труд”, 1918, № 85, 13 (01) июня, с. 4.

[90] *Местная жизнь. Городская дума. Белорусский вопрос*, „Труд”, 1918, № 98, 26 (13) июня, с. 3.

[91] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 75-75 адв. Пратакол № 6 пасяджэння ВК МБР ад 2.07.1918 г.

[92] *Местная жизнь. Исполнительный комитет могилёвской белорусской рады о могилёвской городской думе*, „Труд”, 1918, № 114, 12 июля, с. 2-3.

акупацыйных войск: „В беседе о финансировании местных учебных заведений коснулись Центральной Белорусской Рады. Е. Олехнович и В. Лукин заявили, что они являются членами Исп[олнительного] Комитета Мог[илевской] Белорусской Рады. Представ[итель] герм[анских] войск выразил свое удовольствие относительно возможности познакомиться с деятельностью Мог[илевской] Белор[усской] Рады и просил осведомить его о том, есть ли в Мог[илевской] Раде помещики и какой ориентации держится Мог[илевская] Рада. Е. Олехнович ответил, что помещики в Раде есть, что же касается ориентации Мог[илевской] Рады, то она стоит **за** самостоятельность Белоруссии, в экономическом же отношении Белоруссия по мнению Мог[илевской] Рады должна опираться на Украину. Представитель герм[анских] оккуп[ационных] войск выразил желание поближе познакомиться с Мог[илевской] Белорусской Радой и просил установить возможность постоянного общения между ним и Радой. Кроме того он просил дать ему переводчика для перевода его распоряжений на белорусский язык"[93]. 11 ліпеня 1918 г. на пасяджэнні ВК МБР быў створаны адмысловы орган для стасункаў з прадстаўнікамі германскіх акупацыйных войск у складзе: М. Кахановіч, Дз. Даўгяла, В. Какашынскі, Я. Аляхновіч[94].

Напрыканцы ліпеня 1918 г. Магілёў наведаў Іван Луцкевіч. 27 ліпеня ён выступіў з дакладам на пасяджэнні Выканаўчага камітэта Магілёўскай Беларускай Рады: „Подробно доложил о деятельности Виленской Белорусской Рады, а также сообщил краткие сведения о ближайшей деятельности Минской Белорусской Рады"[95]. Па ўспамінах М. Кахановіча: „Іван Іванавіч раіў нам моцна трымацца лёзунгу „Непадзельная і незалежная Беларусь" і ўсімі сіламі змагацца з ворагамі беларускага адраджэньня"[96].

За некалькі дзён славуты беларускі дзеяч пазнаёміўся з горадам, яго архітэктурным абліччам, станам беларускай справы, наведаў музеі і адшукаў у царкоўна-гістарычным музеі Магілёва некалькі асобнікаў унікальных старабеларускіх выданняў. Ад'язджаючы з горада, І. Луцкевіч выказаў сваё задавальненне тым, што „Магілёў мае беларускі твар і беларускую душу, ня гледзячы на антыбеларускую палітыку апошніх сталецьцяў"[97]. Акрамя Магілёва, І. Луцкевіч наведаў Оршу і Бабруйск[98].

[93] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 136, арк. 78 адв.-79 адв. Пратакол пасяджэння ВК МБР ад 11.07.1918 г.

[94] Там жа, арк. 79адв. Пратакол пасяджэння ВК МБР ад 11.07.1918 г.

[95] Там жа, арк. 80. Пратакол пасяджэння ВК МБР ад 27.07.1918 г.

[96] Ю. Васілеўскі, *Успаміны Міхаіла Кахановіча „Іван Луцкевіч у Магілёве"*, „Ратуша", 1993, 14-20 кастр., с. 6.

[97] Там жа.

[98] *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі*, т. 1, кн. 1, с. 274.

Завяршэннем пакрокавай стратэгіі МБК можна лічыць яго заявы ў абарону самастойнасці і незалежнасці беларускай дзяржавы.

Дадатковая расійска-нямецкая дамова была падпісана 27 жніўня 1918 г., і згодна з ёй нямецкае войска мелася пакінуць беларускія землі на ўсход ад Беразіны (Дняпроўскай), уключна з Магілёўшчынай[99], якія адыходзілі да Савецкай Расіі.

Ратуючыся ад бальшавіцкай навалы, МБК вырашыў перабрацца ў Мінск. 27 верасня 1918 г. старшыня Выканаўчага камітэта МБР Міхаіл Кахановіч накіраваў ліст з Магілёва Народнаму Сакратарыяту БНР з просьбаю аб выдзяленні памяшкання для Камітэта ў Мінску і аб асігнаванні грошай на пераезд[100].

30 верасня 1918 г. беларускі генеральны консул ва Украіне накіраваў ліст на імя старшыні Беларускай дэлегацыі на міжнародных перамовах Антона Луцкевіча: „Маем гонар перадаць два пратэсты Магілёўскага Беларускага Камітэта ад 29.09.1918 г. № 411 і № 412 на імя Урада РСФСР і Украінскай дзяржавы”[101].

Змест першага пад вых. № 411 ад 22.09.1918 г.: „Могилевский Белорусский Комитет. гор. Могилев губ. Правительству Российской федеративной советской республики в лице Председателя русской делегации для ведения мирных переговоров с Украинской державой. Могилевская Белорусская Рада, в заседании от 21 сентября 1918 года, рассмотрев вопрос о создавшемся, вследствие условий дополнительного к Брест-Литовскому договора, положении, устанавливающим принадлежность Белоруссии к составу Российской федеративной советской республики, после обмена мнениями, постановила: Довести до сведения правительства Российской федеративной советской республики и правительства Украинской державы, что Могилевская Белорусская Рада считает последний „дополнительный” договор между Россией и Германией нарушением прав Белорусского народа на самоопределение, на независимость и неделимость Белоруссии, провозглашенныя I-ым всебелорусским конгрессом в г. Минске 17-31 декабря 1917 года. Поэтому Могилевская Белорусская Рада протестует против непризнания Брестским и дополнительным к нему договорами между Российской федеративной советской республикой и Германией прав Белорусского народа на самостоятельное государственное существование, при условии объединения всех белорусских земель в одном самостоятельном государстве, о чем и доводит до сведения правительства Российской федеративной советской республики и Украинской державы. Председатель комитета М. Коханович. Сек-

[99] Там жа, с. 259-260.
[100] Там жа, с. 261.
[101] LVCA, f. 582, ap. 2, b. 9, lap. 1. Ліст Беларускага Генеральнага Консула ва Украіне.

ретарь. Подписи. Печать „Могилевский Белорусский Комитет”. Ліст з такім жа зместам пад вых. № 412 быў накіраваны „В Совет Министров Украинской державы Министру иностранных дел”[102].

Антон Луцкевіч 30 верасня 1918 г. пераслаў пратэсты МБК (МБР) міністру замежных спраў Украіны і старшыні Расійскай мірнай дэлегацыі Хрыстыяну Ракоўскаму (Кіеў)[103].

Існуе версія, што менавіта за прызнанне незалежнасці Беларусі, пасля ўсталявання савецкай улады ў 1919 г., Магілёў пазбавілі губернскага статуса,ператварыўшы яго ў павятовы цэнтр Гомельскай губерні РСФСР.

МБК спыніў сваю дзейнасць напрыканцы кастрычніка 1918 г. Да пачатку лістапада 1918 г. бальшавіцкія войскі часткова занялі Магілёўскі павет і г. Магілёў. Аб гэтым адзначана 5 лістапада 1918 г. у Ноце Надзвычайнай дэлегацыі Рады БНР міністру замежных спраў Украіны аб найхутчэйшым прызнанні незалежнасці БНР[104]. Заняцце Магілёва разглядалася як акупацыя Расіяй. Бальшавіцкі ўрад здзейсніў планы расколу Беларусі — па ваенна-стратэгічных меркаваннях да РСФСР далучылі Віцебшчыну, Магілёўшчыну і Гомельшчыну.

Такім чынам, дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта, Беларускага камітэта гласных Гарадской думы г. Магілёва ў 1917-1918 гг. абвяргае ўсталяваныя стэрэатыпы, што пануюць у адносінах да ролі ўсходнебеларускіх гарадоў у нацыятворчых працэсах XX ст. Праведзенае даследаванне дазваляе па-новаму ацаніць ролю ўсходнебеларускай эліты ў справе нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, нацыянальнага самавызначэння і ідэнтыфікацыі беларускага насельніцтва. Вынікам самавызначэння беларусаў Магілёва можна лічыць правядзенне сходу 31 сакавіка 1918 г. — адзінага выпадку маштабнай падтрымкі стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі ў значным цэнтры Беларусі. Узнікненне і станаўленне БНР непарыўна звязана з гісторыяй Магілёва і Магілёўшчыны.

Дакументы з фондаў архіваў Беларусі і Літвы дазваляюць комплексна рэканструяваць арганізацыю і стварэнне вясною 1917 г. у Магілёве першай нацыянальнай арганізацыі беларусаў — Магілёўскага Беларускага Камітэта. Аналіз яго статута, праграмных мэт і арганізацыйнай працы ў 1917-1918 гг. схіляе да высновы, што ў аснове была беларуская нацыянальная ідэя. Аб гэтым сведчыць наяўнасць у дзейнасці МБК такіх яе элементаў (кірункаў), як гісторыя, этнічныя традыцыі (этнічныя

102 LVCA, f. 582, ap. 2, b. 9, lap. 4-4 адв., 5-6. Лісты — пратэсты МБК; БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 137, арк. 46-48. Чарнавыя накіды заяў Магілёўскай беларускай рады ўрадам Расіі і Украіны з пратэстам.

103 *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі*, т. 1, кн. 1, с. 264.

104 Там жа, с. 290-291.

сувязі, фальклор, зямля продкаў, мова, рэлігія, звычаі, паходжанне), імкненне да незалежнасці. Можна сцвярджаць, што стварэнне Магілёўскага Беларускага Камітэта — гэта першае ў ХХ ст. на тэрыторыі Усходняй Беларусі выйсце на палітычную і міжнародную арэну грамадскай арганізацыі, якая з'яўлялася носьбітам ідэалагічнага руху па дасягненні і замацаванні аўтаноміі, адзінства і індывідуальнасцей беларускай нацыі. За час свайго існавання палітычныя погляды МБК эвалюцыянавалі ад ідэі нацыянальнай аўтаноміі да ўхвалення стварэння незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі.

Summary

The self-determination of the Belarusians in Mogilev during World War I

